У Камітэце па міжнародных Ленінскіх прэміях „За ўмацаванне міру паміж народамі“

5 і 11 лістапада 1957 года пад старшынствам акадэміка Д. В. Скабельцына адбыліся пасяджэнні Камітэта па міжнародных Ленінскіх прэміях «За ўмацаванне міру паміж народамі».

Камітэт разгледзеў паступіўшыя прапановы аб прысуджэнні міжнародных Ленінскіх прэмій і прыняў рашэнне па гэтаму пытанню.

Ніжэй публікуецца пастанова Камітэта аб прысуджэнні міжнародных Ленінскіх прэмій «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1956 год.

Аб прысуджэнні міжнародных Ленінскіх прэмій „За ўмацаванне міру паміж народамі“ за 1956 год

ПАСТАНОВА КАМІТЭТА ПА МІЖНАРОДНЫХ ЛЕНІНСКІХ ПРЭМІЯХ «ЗА ЎМАЦАВАННЕ МІРУ ПАМІЖ НАРОДАМІ» АД 11 ЛІСТАПАДА 1957 ГОДА

За выдатныя заслугі ў справе барацьбы за захаванне і ўмацаванне міру прысудзіць міжнародныя Ленінскія прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» наступным асобам:

Чандрасекхару Венкату **Раману** — вучонаму-фізіку, прэзідэнту Індыйскай Акадэміі навук.

Эманюэлю д'Асцье дэ ла **Віжэры**—грамадскаму дзеячу, віцэ-старшыні Сусветнага Савета Міру (Францыя).

Марыі Роса **Алівер** — пісьменніцы і грамадскаму дзеячу, члену Сусветнага Савета Міру (Аргенціна).

Мікалаю Сямёнавічу **Ціханаву** — пісьменніку, старшыні Савецкага камітэта абароны міру (СССР).

Удакендавала **Сарананкара** Тхеро—будзійскаму свяшчэнніку (Цэйлон).

Даніла **Дольчы** — пісьменніку і грамадскаму дзеячу (Італія).

Генрыху **Брандвайнеру** — прафесару міжнароднага і царкоўнага права універсітэта гор. Грац (Аўстрыя).

Старшыня Камітэта
Дзмітрый **СКАБЕЛЬЦЫН**.
Намеснікі старшыні Камітэта
ГО МО-ЖО, Луі **АРАГОН**.
Члены Камітэта:
Грыгорый **АЛЯКСАНДРАЎ**,
Джон **БЕРНАЛ**, Ян **ДАМБОЎСКІ**,
Анна **ЗЕГЕРС**, Пабло **НЕРУДА**,
Міхаіл **САДАВЯНУ**,
Сагіб Сінг **САКХЕЙ**,
Ілья **ЭРЭНБУРГ**.

◆

У маскоўскіх выдавецтвах

За новымі творамі беларускіх пісьменнікаў з цікавасцю сочаць чытачы брацкіх рэспублік. У гэтым годзе, як і ў мінулыя гады, у выдавецтвах Масквы запланавана друкаванне многіх твораў празаікаў і паэтаў Беларусі.

У выдавецтве «Советский писатель» выйдуць кнігі «Калі зліваюцца рэкі» П. Броўкі, творы П. Галавача, «За годам год» Ул. Карпава, зборнікі вершаў М. Васілька, К. Буйлы, М. Танка, байкі Э. Валасевіча.

Дзіцячае дзяржаўнае выдавецтва выдае кніжкі «Семнаццаць год» К. Чорнага, «Кліча вецер свежы» Э. Агняцвет, «Вавёрчына гара» В. Віткі. Выдавецтва «Знание» запланавала брашуры беларускіх аўтараў «Як мы павышаем прадукцыйнасць жывёлагадоўлі» старшыні калгаса І. Сяргеева, «Сучасная фізіка і дыялектычны матэрыялізм» акадэміка Б. Сцяпанава, «Свет мізэрна малых істот» доктара медыцынскіх навук Б. Эльсберга.

У паэтычнай секцыі

Секцыя паэзіі на сваім чарговым пасяджэнні абмеркавала творчасць М. Скрыпкі.

— Сатырычныя вершы і байкі Міхася Скрыпкі, — сказаў дакладчык Мікола **Хведаровіч**, — часта з'яўляюцца ў газетах і часопісах. У паэта ёсць добрая назіральнасць, уменне ўзнімаць надзённыя пытанні жыцця, адчуванне мастацкага слова. Асабліва ўдаюцца М. Скрыпку сатырычныя мініятуры і эпіграмы. Што ж датычыцца баек паэта, дык большасць з іх празмерна расцягнута і не мае неабходнай для гэтага жанра вастрыні і дынамічнасці сюжэта.

У абмеркаванні вершаў М. Скрыпкі прынялі ўдзел **А. Астрэйка**, **А. Звонак**, **Ул. Корбан**, **М. Калачынскі**, **А. Александровіч**.

Секцыя рэкамендавала М. Скрыпку ў члены Саюза пісьменнікаў.

Мастацка-метадычныя канцэрты

На калгасных сцэнах Жалудоцкага раёна выступае канцэртная брыгада Гродзенскага абласнога Дома народнай творчасці. З мастацка-метадычнымі канцэртамі самадзейныя артысты ўжо выступілі перад жыхарамі райцэнтра, хлебаробамі калгасаў імя Жданава, імя Дзяржынскага, «1 Мая» і іншых. За гэты час яны абслужылі канцэртамі каля двух тысяч жыхароў.

На месцах брыгада аказвае практычную дапамогу гурткам мастацкай самадзейнасці, дае метадычныя парады.

П. БАРОДКА.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 2 (1224) | Субота, 4 студзеня 1958 года | Цана 40 кап

Новыя радасці

Алесь РЫЛЬКО

Добрая звычка бытуе ў нашым жыцці: заўсёды к канцу года падлічваць свае поспехі і дасягненні за мінулыя 365 дзён. І заўсёды ёсць што ўспамянуць — значнае, вялікае. Жыццё настолькі змястоўна, яно так бурліва ідзе к лепшаму, новаму, што вялікія змены становяцца абыдзёнымі і на іх іншы раз не заўсёды звяртаеш патрэбную ўвагу. Новыя дамы і вытворчыя гмахі, новыя электрастанцыі і цэлыя гарады; багацце прадуктаў на рынку, у магазінах і адначасовае павелічэнне заробку працоўнага чалавека; палёт савецкай тэхнікі пад самымі зорамі і навейшыя машыны ў прамысловасці, на калгасных палях; небывалы росквіт савецкай літаратуры, мастацтва і канчатковае, на векі вечныя знікненне горкага клопату чалавека: «А як бы мне сёння здабыць кавалак хлеба?» Так, канула ў нябыт балючая прымаўка: «Хлеб мой абыдзённы... сам ссох і мяне ссушыў».

За тыдзень да Новага года быў я ў Слуцкім раёне. І вось я ў гарадской сталоўцы грэюся з марозу гарачай стравай. За столікамі поўна людзей, пераважна калгаснікаў, якія наведаліся ў горад па розных справах. Засмучаных твараў не відаць, усе радасныя, узбуджаныя, гамонка наўкола гучная, — міжволі пачуеш пра цікавыя рэчы.

— Прыходжу я ўвечары дамоў, — расказвае з хітрай усмешкай у вачах чарнявы мужчына, — гляджу і... што гэта такое? Хлапчукоў поўны двор, абступілі майго сабаку і кожны частуе яго хлебам, а то і кілбасой. А ў сабакі на спіне прывязаны нейкі клунак. Пытаю ў свайго гарэзніка: «Што гэта за прадстаўленне тут? Навошта сабаку мучыце?» Адказвае: «Трэніруем Кудліка ў палёт».—«Які палёт?»—«На спадарожніку, наўкола Зямлі».—«А што вы яму прывязалі да спіны?»—«Парашут. Каб дамоў вярнуўся...»—«Дык чаму ж менавіта Кудліку такая павага, а не якому іншаму сабаку?»—«Бо ён з морды вельмі падобны на спадарожніцкую Лайку»,— хорам адказваюць дзеці.

Мужчыны, што слухалі расказчыка, смяюцца, а адзін дзядзька, які ўвесь час стараўся са свайго бялявага вуса зрабіць вострае шыла, павёў гутарку далей:

— А ці ведаеце, браткі, тая ж самая Лайка, пралятаючы над Нью-Йоркам, заўсёды брахала, нібы гэта яна загнала ліса ў нару. Дык амерыканскія сабакі, пачуўшы яе голас, усе дашчэнту ашалелі, пакусалі адзін аднаго...

Рагочуць дзядзькі, па костачках перабіраючы «амерыканскіх сабак», вядома, не тых, што бегаюць на чатырох нагах, а іншых. Мужчыны абмяркоўваюць апошнія міжнародныя навіны, гавораць і пра вайну і пра мір, які «быць таго не можа — будзе! Нашы людзі, папомніш маё слова, прыціснуць хвост заморскім падваротнікам, яны і не пікнуць са сваёй вайной!»

— Эге ж! Рускага чалавека не дагоніш і ў карак не натаўчэш! — кажа з сівымі скронямі дзядзька. Гаворыць гэты чалавек у гадах на чыстай беларускай мове—беларус ён, вядома, аднак з гонарам адносіць сябе да ліку рускіх. І гэта прыемна чуць. Словы «рускі чалавек» цяпер часцей за ўсё, як вядома, ужываюцца ў сэнсе—савецкі.

І зноў гамонка пра спадарожніка:

— На тым бы спадарожніку што-небудзь такое змайстраваць, каб паны аж адварачваліся.

— Гэтага дыпламаты нашы не дазволяць...

— Чаму? Быць таго не можа! Урэшце, наш спадарожнік для добрага чалавека — пшанічны каравай, а для злыдня — ён костка ў горла.

Дзед, які сядзеў са мной за адным столікам, уважліва прыслухоўваўся да размовы суседзяў і ў знак згоды з іміківаў галавой. Нарэшце стары, пагледаючы на мяне з пад калматых броваў, рабіў з пачутага свой вывад:

— Вясёлы наш народ. Яму няўклюда лепш не трапляй на язык — засмяе. І заўваж, сынку, — казаў далей ён, — красцянін пад'еў цяпер хлеба, бо за палітыку ўзяўся... А пасля ж вайны толькі і гамонкі было, што пра зямлянкі ды бульбачку дробную...

Справа за сталом — бабуля з унукам, якія ласаваўся пернікамі, і кума ці сваццця бабулі. Жанчыны сагрэліся і згарнулі на плечы хусткі. Паміж імі таксама цікавая размова:

— А даражэнькая мая, дык гэта ж я ў Слуцак чаго прыехала? Ведаеш, пачалі ў яго расці, — і кіўнула галавой на ўнука,— зубкі пілачкай, у дзве баразёнкі. У малога лішнія, а ў старой не хапае... — тут бабка прытуліла руку да шчакі. — Засталося ў мяне рэшты зубоў з пяток, дык і тыя спакою не даюць. Думала — перацярплю, але дзе там! — не ўседзела дома. і не хацелася далёка ехаць, бо свая бальніца днямі, якраз к Новаму году, адкрыецца. На выгане ў нашых Мялешках, каб ты бачыла, які палац калгас будуе!.. І высокі, і пад белай бляхай! Самі для сябе будуем бальніцу.

Пачуўшы назву Мялешкі, я глянуў у блакнот і знайшоў паметку, што цэнтр калгаса імя Калініна — якраз у гэтым населеным пункце. «Новая бальніца,—падумаў я, — добры падарунак людзям к Новаму году. Такі факт — знаходка для нарыса. Паеду ў Мялешкі!» — канчаткова вырашыў я, аддаючы перавагу калгасу імя Калініна перад іншымі сельгасарцелямі. Атрымлівалася, што «зубкі пілачкай» ва ўнука і нястача іх у бабкі дапамаглі мне канчаткова вырашыць маршрут.

У сталовай цікава было заўважыць і тое, што прыезджыя сяляне не частуюцца прыпасамі з торбаў, а заказваюць афіцыянткам «гарадскую страву». І плоцяць не апошняй траячкай, а адлічваюць грошы з ёмкіх жмутоў. Значыць — ёсць у людзей грошы! Яно і не дзіва, наўкола — калгасы-мільянеры!

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ЭНТУЗІЯСТЫ КУЛЬТАСВЕТРАБОТЫ

Справы Шуры Новікавай

Белай коўдрай снегу пакрыты палі саўгаса «Чавускі». Адпачывае, набіраецца сіл карміліца-зямля. Па-ранейшаму не сціхае над прасторамі гул матораў, вясёлая і радасная песня працы. Земляробы рыхтуюць і вывозяць на палі мясцовыя ўгнаенні, ачышчаюць насенне, узводзяць новыя будынкі.

Але вось згусціўся вячэрні змрок. У хатах ярка ўспыхнулі агні. Прыветліва расчыніліся дзверы клуба, хаты-чытальні, бібліятэкі. Прыемна ўвечары зайсці сюды, паслухаць лекцыю, паглядзець фільм, прыняць удзел у дыскусіі па хвалюючай кнізе, пачытаць свежы часопіс, цікавую брашуру.

Многа людзей каля стала выдачы кніг. Загадчыца бібліятэкі камсамолка Шура Новікава хутка выдае патрэбныя кнігі, дае парады.

...А гады два назад Шура Новікава адчувала сябе пакрыўджанай. Многія яе сяброўкі атрымалі прызначэнне на работу ў раённыя цэнтры, а яна — у нейкую далёкую вёску. Ці варта было для гэтага столькі год вучыцца?

У раённы цэнтр Чавусы яна прыехала пахмурым восеньскім днём. Наведаўшы аддзел культуры, вырашыла як мага хутчэй дабірацца да месца. У кузаве падарожнай машыны яшчэ больш засумавала: «Што чакае мяне ў гэтай Асінаўцы?»

Машына імчалася па няроўнай дарозе, кузаў часта падкідала, трэсла. Прыкрыўшы твар ад дажджу каўняром паліто, Шура глядзела на краявід. З-за ўзгорка нечакана ўзнікла вёска.

— Вось і Асінаўка, — крыкнуў шафёр.

На сярэдзіне вуліцы, каля вялікага будынка, дзяўчына ўбачыла крыва прыбітую дошчачку з надпісам: «Бібліятэка». На дзвярах вісеў замок. Шура пастаяла на ганку, паспрабавала заглянуць у акно і ледзь не заплакала. Раптам яе паклікалі:

— Вы часам не новая бібліятэкарка?

Сярэдніх год мужчына ў мокрай брызентавай накідцы аказаўся старшынёй сельскага Савета. Ён дапамог дзяўчыне ўладзіцца на кватэру.

Раніцай Шура пайшла ў бібліятэку. Вельмі ўжо непрыглядныя былі пакрытыя пылам голыя сцены, брудная падлога.

Новая бібліятэкарка пачала з уборкі. Падмяла падлогу, выцерла сцены. На шафе знайшла скручаныя ў трубку партрэты Горкага і Маякоўскага. Прымацавала іх на сцяне. Вымыла запылены графін, наліла ў яго вады і паставіла на стол. Расклала на стале кніжкі і часопісы.

...Першыя дні работы прайшлі нявесела. Наведвальнікі заходзілі рэдка, здзіўляліся, што бібліятэка адчынена.

Тут цяпер было ўтульна, цёпла, на стале ляжалі свежыя газеты і часопісы. Чаму-ж не пасядзець ды не пачытаць? Аднак кніжкамі рабочыя саўгаса цікавіліся мала.

Адшукаўшы аркуш добрай паперы, Шура напісала на ім словы Горкага: «Усім добрым ва мне я абавязаны кнігам». Плакат гэты прымацавала на самым відным месцы. Усе, хто заходзіў у памяшканне, не маглі не заўважыць яго.

Аднойчы ў бібліятэку зайшоў сакратар партыйнай арганізацыі саўгаса тав. Супін.

— Чуў, што ў нас новы бібліятэкар, — ветліва сказаў ён Шуры. — Ну, як працуецца?

— Чытачоў мала...

— Не засмучайцеся. Я ўжо тут даўно жыву, амаль усіх ведаю. Не ходзяць сюды не таму, што не любяць кнігу, а проста не прывыклі да бібліятэкі. Вы пахадзіце па хатах, пагаварыце з людзьмі.

Шура так і зрабіла. Зайшла ў клуб, у хату-чытальню, дзе вечарам збіраецца моладзь, пабывала ў рабочых. Спачатку гаварыла аб жыццёвых справах, потым пераводзіла размову на газеты, кнігі.

З кожным днём у бібліятэку прыходзіла ўсё больш і больш людзей. У асноўным гэта была моладзь.

Аднойчы Шура пачала чытаць уголас «Глыбокую плынь» І. Шамякіна. На другі вечар, заўважыўшы, што прысутным спадабаўся раман, Шура на самым цікавым месцы загарнула кніжку. Слухачы захваляваліся:

—А далей што? Забілі яе ці не? Чытай!

Але Шура схітрыла:

— Не магу — работы многа. Хто жадае, вазьміце, калі ласка, кніжку — пачытайце самі.

Прыбавілася адразу шэсць чытачоў, якія запісаліся ў чаргу па «Глыбокую плынь».

Неўзабаве сярод чытачоў ужо былі і пажылыя хлебаробы. Пачалі прыходзіць людзі з іншых населеных пунктаў. З дапамогай партыйнай арганізацыі Шура Новікава арганізавала пяць бібліятэк-перасовак. Яны задавальняюць попыт на кнігу жыхароў вёсак Слабада, Нежкаўка, Альхоўка, Луцішча.

Расце колькасць чытачоў у Асінаўскай сельскай бібліятэцы. Многія з іх за год прачыталі па дваццаць і больш кніжак. Гэта — рабочыя саўгаса Рыгор Кандрацэнка, Хведар Іваноў, Марыя Сакалова, калгаснік сельгасарцелі «Новае жыццё» Мікола Майсеенка і інш.

У бібліятэцы праводзяцца канферэнцыі чытачоў, літаратурныя вечары. Не так даўно ажыўлена абмяркоўвалася аповесць Л. Абухавай «Глыбіньгарадок». Многія чытачы прынялі ўдзел у літаратурным вечары на тэму «Вобраз Уладзіміра Ільіча Леніна ў мастацкай літаратуры».

У аглядзе культасветустаноў Асінаўская сельская бібліятэка заняла адно з першых месц у Магілёўскай вобласці. У гэтым вялікая заслуга загадчыцы бібліятэкі Шуры Новікавай. І калі цяпер у Шуры пытаешся пра яе работу, жыццё, яна задаволена адказвае:

— Працуецца добра і жывецца таксама. Так звыклася з гэтымі мясцінамі, што лепш ад іх, здаецца, няма нідзе. Дарэмна з першых дзён так хвалявалася...

Ул. МАЗІЛІН.

Выстаўка работ румынскага мастака



У Мінскім салоне-магазіне беларускага аддзялення мастацкага фонду СССР выстаўлены малюнкі заслужанага дзеяча мастацтва Румынскай Народнай Рэспублікі Аўрэла Жыкідэ. Яго імя добра вядома ў Румыніі. Жыкідэ — адзін са старэйшых графікаў. Уся яго творчасць звязана з гэтым жанрам.

Талент мастака раскрыўся асабліва ярка і поўна ў гады дэмакратычнай Румыніі. Яго малюнкі набылі глыбокі сацыяльны змест. Яны праўдзіва і яскрава адлюстроўваюць жыццё. Героі Жыкідэ — простыя людзі, сяляне і сялянкі, якія смела і настойліва змагаюцца за лепшую долю.

Амаль усе сорак работ, якія прадстаўлены на выстаўцы, — творы з цыклу «1907 год». Падзеі 1905 года ў Расіі знайшлі водгук у Румыніі, і мастак, усхваляваны гэтымі падзеямі, стварыў серыю цікавых малюнкаў.

Наведвальнікаў выстаўкі прыцягвае малюнак «Паўстанцы». Шэры, змрочны дзень. Па мосце праз бурную рачулку ідзе натоўп сялян з косамі і віламі. Мастак не выпісваў кожную фігуру паасобку. Мы нават не бачым твараў паўстанцаў. Але мастак перадаў настрой натоўпу, яго імклівасць і рашучасць. У такім жа плане вырашаны малюнак «Напад». Усхваляваныя сяляне рушаць да маёнтка. І зноў няма твараў. Але мы ведаем, што рухае гэтых беззямельных і галодных людзей. З такім жа майстэрствам зроблены малюнкі «Хочам зямлі», «Не страляем!», «Гэта ўсё, што засталося» і інш.

Глыбокі па сацыяльнаму зместу малюнак «Абед селяніна».

Вялікая сіла інтэрнацыяналізма адчуваецца ў малюнку «Арышт пацёмкінцаў». Салдаты канваіруюць рускіх маракоў. А ў постацях салдат павага і сімпатыі да герояў першай рускай рэвалюцыі. Цікавыя па вырашэнню і майстэрству малюнкі «Пасля першага залпа», «Ілінка», «На судзе» і інш.

Выстаўку твораў румынскага мастака з цікавасцю наведваюць жыхары сталіцы Беларусі.

На здымках: Малюнкі Аўрэла Жыкідэ. 1. «Ілінка» 2. «Гэта ўсё, што засталося».

Фота **Ул. Крука.**



Палепшыць творчую дзейнасць тэатра

Тэатр оперы і балету адыгрывае вялікую ролю ў прапагандзе здабыткаў беларускай нацыянальнай музычна-сцэнічнай культуры, у развіцці важнейшага жанра мастацтва рэспублікі. У тэатры сканцэнтраваны высокакваліфікаваныя кадры салістаў-вакалістаў і танцораў, таленавітыя калектывы аркестра, хору, балету, пастановачнай часткі. Ён забяспечаны дырыжорамі, рэжысёрамі, балетмайстрамі, хормайстрамі і дэкаратарамі, якія здольны ствараць спектаклі на належным узроўні і задавальняць самыя патрабавальныя эстэтычныя густы гледачоў.

За апошні год тэатрам пастаўлены яркія спектаклі—«Надзежда Дурава» і «Садко», удала ўзноўлены «Міхась Падгорны» і «Князь-возера».

Аднак, як паказалі праверка дзейнасці тэатра Міністэрствам дзяржаўнага кантролю БССР і абмеркаванне вынікаў работы калектыву ў Міністэрстве культуры рэспублікі, у яго творчым жыцці ёсць яшчэ сур'ёзныя хібы.

У загадзе Міністэрства культуры БССР адзначана, што кіраўніцтва тэатра нездавальняюча фарміруе рэпертуар. Перспектыўны рэпертуарны план адсутнічае. Мала ўвагі аддадзена стварэнню беларускіх опер і балетаў. І таму ў юбілейным 1957 годзе тэатр не паставіў ніводнага новага арыгінальнага нацыянальнага спектакля. Нягледзячы на тое, што тэатр мае некалькі дагавораў з кампазітарамі на напісанне новых опер, мастацкае кіраўніцтва калектыву па сутнасці нічога не робіць для іх здзяйснення.

Нездавальняюча працуе мастацкі савет тэатра. Ён не абмяркоўвае сучасны і перспектыўны рэпертуарныя планы, не разглядае творчыя пытанні, якія хвалююць рэжысуру, дырыжораў, мастакоў, праблемы выканаўчага майстэрства артыстаў. Мастацкі савет не стаў яшчэ органам калектыўнай творчай думкі і сапраўдным памочнікам кіраўніцтва тэатра.

Сістэматычна не выконваецца рэпертуарны план. Надта мала ставіцца новых спектакляў. Гэта вынік няправільнай арганізацыі творчага працэсу і нездавальняючай працы пастановачнай часткі. У падрыхтоўцы новых спектакляў няма рытмічнай работы. Часта бываюць доўгія прастоі, а перад выпускам прэм'ер пачынаецца штурмаўшчына.

Адсутнасць загадзя распрацаванага, глыбока прадуманага рэпертуарнага плана, частыя замены твораў не даюць магчымасці пастаноўшчыкам і артыстам належным чынам рыхтавацца да выпуску новых спектакляў. Захаванню і ўзнаўленню рэпертуару аддаецца мала ўвагі і таму спектаклі хутка амартызуюцца. У выніку тэатр дрэнна наведваецца гледачамі.

Не праведзена тарыфікацыя творчых работнікаў. Ёсць артысты, якія ўжо ў значнай ступені страцілі прафесіянальную кваліфікацыю, але ўсё яшчэ займаюць вядучае становішча ў калектыве.

Гэта таксама адмоўна ўплывае на мастацкі ўзровень рэпертуару, не дае магчымасці запрасіць у тэатр новыя кваліфікаваныя кадры, замінае выхоўваць і вылучаць маладых артыстаў. Трупа ўкамплектавана няправільна, няма некаторых патрэбных салістаў, у той час як тут надта многа сапрана і мецца-сапрана.

У загадзе дадзена ацэнка прычын такога становішча ў тэатры оперы і балету. У ім таксама сказана: «Галоўны дырыжор тав. Любімаў Л. В. і галоўны рэжысёр тав. Александроўская Л. П. не займаюцца арганізацыяй вытворчага і творчага працэсу, фарміраваннем рэпертуару тэатра, адышлі ад пытання мастацкага кіраўніцтва калектывам тэатра, звузілі кола сваёй дзейнасці, аддаюць увагу толькі тым спектаклям, у якіх самі ўдзельнічаюць».

Вызначаны меры паляпшэння творчай дзейнасці тэатра і ўмацавання яго сувязей з гледачамі.

Галоўная задача тэатра—стварэнне спектакляў, прысвечаных саракагоддзю БССР, глыбокае адлюстраванне ў рэпертуары жыцця і творчай дзейнасці народа—будаўніка камунізма.

Асаблівая ўвага звернута на арганізацыю ідэйна-выхаваўчай работы ў калектыве.

Тэатру даручана распрацаваць трохгадовы перспектыўны рэпертуарны план, актывізаваць работу па стварэнню беларускага арыгінальнага рэпертуару. У мэтах павышэння кваліфікацыі салістаў трэба перыядычна запрашаць вопытных педагогаў па вакалу і сцэнічнаму руху.

Прадугледжаны і меры паляпшэння арганізацыйна-гаспадарчай дзейнасці тэатра і стварэння больш спрыяльных умоў для наведвання яго гледачамі.

ЛАЎРЭАТЫ ЛЕНІНСКІХ ПРЭМІЙ (злева направа) Мікалай Сямёнавіч **Ціханаў** — пісьменнік, старшыня Савецкага камітэта абароны міру (СССР), Чандрасекхар Венкат **Раман**—вучоны-фізік, прэзідэнт Індыйскай Акадэміі навук, Удакендавала **Саранкара** Тхеро — будзійскі свяшчэннік (Цэйлон), Эманюэль д'Асцье дэ ла **Віжэры** — грамадскі дзеяч, віцэ-старшыня Сусветнага Савета Міру (Францыя), Генрых **Брандвайнер**—прафесар міжнароднага і царкоўнага права універсітэта гор. Грац (Аўстрыя), Марыя Роса **Алівер** — пісьменніца і грамадскі дзеяч, член Сусветнага Савета Міру (Аргенціна), Даніла **Дольчы** — пісьменнік і грамадскі дзеяч (Італія).

(Фатахроніка ТАСС)

Новыя радасці

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На плошчы, каля канавязі, дзе звычайна спыняюцца фурманкі, адзін мужчына расказваў знаёмаму:

— Прывозіў на «Заготжывёлу» здаваць пастаўкі. Апошнія пастаўкі, апошні квіток у кішэні...

Гэтая размова таксама стасавала да тэмы «навагодняя радасць». Сапраўды, ці ж гэта малая радасць для калгаснікаў, што дзяржава адмяніла для іх абавязковыя пастаўкі!

Мялешкі—невялікая вёска з шырокай роўнай вуліцай, хаты ў ёй добра агледжаныя, на сядзібах—яблыневыя і грушавыя сады. Многа дзе пад вокнамі — разложыстыя рабіны з важкімі гронкамі чырвоных ягад. Уздоўж вуліцы—высокія слупы электраліній, прывязаныя да хат тонкімі правадамі. У другім канцы вёскі — пабудовы новага тыпу. Вялікі калгасны клуб. Такі не сорамна было б мець любому раённаму цэнтру. Побач — сельмаг, крыху далей к мосціку — калгасны млын, які працуе на электраэнергіі. Цераз дарогу насупраць млына — цагляны будынак з дахам вохравага колеру, на якім здалёк чытаеш вымураваныя словы: «Лазня. 1957 год.» (Стары год з венічкам пад пахай бегаў па маленькіх курадымках з печмі-каменкамі, а Новы пажадаў раскошы — душавых установак і нават механічнай падачы пары на палкі. Калі ж Новы год будзе дужа пераборлівы, то калі ласка, няхай займае ў лазні асобны нумар і палошчацца там, колькі яго душы пажадаецца). Метраў за сто ад лазні — кантора калгаса, за ёй гараж на 11 аўтамашын, кузня, свіран... Воддаль—з машын згружаюць цэглу і складваюць яе ў невысокія пірамiды — зноў нешта будзе пабудавана... Яшчэ крыху далей — цэлы жывёлагадоўчы гарадок, кароўнікі і цялятнікі, сілосныя збудаванні і кармакухня, воданапорная вежа і пабеленыя шнуры свінарнікаў... Па ўсім двары гарадка ў розных кірунках на сасновых слупках працягнуліся турнікі падвесных дарог... Угары—струны правадоў, па якіх бяжыць электрыка, каб гнаць у аўтапаілкі артэзіянскую ваду, парыць бульбу, шастаць шківамі саламарэзак... Добра звіты вянок грамадскіх будынкаў радуе вока — у ім бачны клапатлівыя адносіны людзей да грамадскага дабра.

Але хопіць, пакуль гаварыць пра кароў і свіней, зойдзем на будаўніцтва калгаснай бальніцы, туды, дзе выпадкам занядужаўшы, будзе лячыцца чалавек. Вунь, на роўнай пляцоўцы за клубам, узвышаецца прасторны будынак пад бліскучым капелюшом бляхі. Склюдаванае бярвенне мачтавай сасны змацавана вугламі ў замок, шырокія праёмы акон, высокі цагляны падмурак... Палавіна памяшкання — з зашклёнымі вокнамі. Тут пад самы Новы год адкрыты амбулаторныя кабінеты. У другой палавіне — грукаюць сякеры, завіваюць стружкі з сухіх дошак вострыя гэблі... Брыгадзір будаўнікоў Аляксандр Захарэвіч не без гонару расказвае:

— Памер карыснай плошчы бальніцы—224 квадратныя метры. Сем палат, ізалятар. Гэта акрамя амбулаторных кабінетаў і кухні, пад якую будзем будаваць асобны домік. Як скончым такі палац, дык і пахварэць не страшна будзе...—усміхаецца ён і сур'ёзна дадае:—Акрамя затрачаных працадзён, калгас выдаткаваў на гэты аб'ект 20 тысяч рублёў.

— А часта хварэюць людзі ў вёсцы?

— Якое табе! — адказвае паважаны цясляр калгаса Якаў Шыловіч, партрэт якога красуецца на Дошцы гонару.—Эпідэмічных захворванняў—тыфусу ці там іншай якой трасцы — даўным-даўно са свечкай не знойдзеш, бо медыцына наша вартая добрага слова. У людзей цяпер менш хворасці, аднак, яны больш лечацца. Крыху прастудзіцца іншы, ці там у бок нечага трохі кальне—адразу да доктара: давай яму розныя мазі-шмазі, ды яшчэ просіць, каб пеніцыліну ўкалолі. Наогул, на пеніцылін,—жартуючы, расказвае далей дзядзька,—пайшла зараз вялікая мода. Не гаворачы пра людзей, дык нават жывёла зласавалася гэтым каштоўным лякарствам. Ледзь толькі з'есць свінчо не тую бульбіну, адразу адкіне лыч у бок і давай яму «хуткую дапамогу!» У белых халатах да яго навыперадкі бягуць зетфельчар, заатэхнік, а яна, свінячая морда, толькі рохкае ад задавалення, тым больш, калі дактары прыпішуць цёплыя ванны...

Закурыўшы, цясляр без жартаў заключыў:

— О, не тое цяпер жыццё! Да чалавека сапраўды па-людску ставяцца ўсюды, куды ні глянь. А ў даўнейшыя часы: гібееш ты — гібей, гінеш—туды табе і дарога...

Пра вялікія клопаты аб чалавеку расказвае і Аляксандр Захарэвіч:

— У 1958 годзе вось на гэтай плошчы, паблізу ад бальніцы, пасадзім парк, пабудуем спартыўны гарадок... Акрамя сезонных дзіцячых ясляў, якія ёсць ва ўсіх шасці брыгадах калгаса, пачнем будаўніцтва дзіцячага сада, які будзе працаваць круглы год. Разумееце, дзіця—не парася, у загародцы яго не выкачаеш... Малому грамадзяніну трэба даваць з першых дзён яго жыцця вялікія правы: права на раддом, права на яслі, дзіцячую кансультацыю і іншыя добрыя рэчы...

Аляксандр Кандратавіч не забывае ўспамянуць і пра тое, што сёлета ў калгасах пастаўлена многа грамадскіх будынкаў. Акрамя бальніцы, лазні і млына, пабудаваны клубы ў другой і шостай паляводчых брыгадах, чатыры гумны, аўчарнік і інш. Нарыхтоўваецца матэрыял на будаўніцтва ў наступным годзе дадатковых канюшні, цялятніка, сушылкі, гумнаў, сховішчаў для гародніны...

— Кожны год будуемся, — задаволена кажа брыгадзір, — і канца краю не відаць гэтаму будаўніцтву!

— А няўжо ў будаўніцтве бывае нейкі край? — перапыняе яго сакратар партарганізацыі калгаса Антось Брытвіч, укладваючы ў слова «будаўніцтва» значна большы сэнс, чым толькі праца цесляра. — Усё будуецца — куды ні кінь вокам! Жыццё наша шліфуецца, як каштоўны камень!

Перад Новым годам калгаснікі атрымалі поўны разлік за сваю працу. На працадзень выдадзена па восем рублёў грашыма, два кілаграмы хлеба, тры кілаграмы бульбы, без малога па два кілаграмы грубых кармоў для ўласнай жывёлы. Агульны грашовы прыбытак калгаса за год склаў амаль чатыры мільёны рублёў. Гаспадарка мае жывёлагадоўча-збожжавае накіраванне, таму гэтыя дзве галіны—паляводства і жывёлагадоўля — асноўныя крыніцы прыбыткаў. Сёлета з гектара атрымана ў сярэднім па 17 цэнтнераў збожжавых, а ў брыгадзе вёскі Лошыца азімая пшаніца і ячмень далі на круг па 19 цэнтнераў, у брыгадах жа вёсак Баркі і Баравуха яшчэ лепшы ўраджай — аж па 24 цэнтнеры. У 1957 годзе ад фуражнай каровы надоена ў сярэднім па дзве тысячы літраў малака. На сто гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў атрымана 224 цэнтнеры малака і 30,5 цэнтнера мяса. На сто гектараў ворыўнай зямлі атрымана роўна 50 цэнтнераў свініны... Наогул, усе планавыя заданні гаспадарка значна перавыканала.

Калгаснікі здабылі гэтыя паказчыкі ў старанная працы, штодзённых клопатах. Ім ёсць чым праводзіць добры Стары год, было чым сустрэць і Новы. У кожнай сям'і—радасць, сапраўднае свята. Праўда, ёсць у калгасе некалькі чалавек, якім Стары год у апошнія свае дні паднёс горкую пілюлю.

Нядаўна старшыня калгаса Сяргей Сямёнавіч Паляшчук у тры гадзіны ночы правяраў начных вартаўнікоў. Пад'ехаў да канюшні ў вёсцы Баравуха, паклікаў вартаўніка Васіля Брытвіча—не чуваць таго. Тады старшыня накіраваўся да яго ў хату і знайшоў гаспадара ў цёплым кажуху на цёплай печы. Убачыўшы нечаканага госця, вартаўнік кулём з печы...

— Чаго ты дома? — пытае Паляшчук.

Бачыць Брытвіч — нявыкрутка яму. Давай цягнуць ваду на гару:

— А ведаеш, старшынька, замерзлі губы, дык я заскочыў на хвіліну, каб гэта самае...

— Пацалаваць жонку, губы сагрэць?

— Якое там!.. Ходзіш усю ноч, губы адтапырыўшы — свішчаш, каб сабака цябе пільнаваўся... А на двары сцюжа...

— Ну, што ж, мы цябе раніцой сагрэем... — паабяцаў старшыня.

І «сагрэлі»: назаўтра з мясцовага радыёвузла ўвесь калгас даведаўся, як Васіль Брытвіч уначы... свішча дома на печы. Мала такога сораму, дык атрымаў, вартаўнік, яшчэ і пакаранне—штраф на некалькі працадзён. Адхапіўшы такі перадНавагодні «падарунак», Васіль цэлы дзень высвістваў такую сумную песню, што аж сабака ягоны завыў.

А то вось яшчэ выпадак. Адзін калгаснік, мужчына сярэдніх год(не будзем называць прозвішча, няхай яму і без таго будзе брыдка), часценька заглядваў у чарку. А выпіўшы, лез, як певень, біцца да любога стрэчнага. І адкуль у яго спрыт браўся?.. На працы, звычайна, адкапыліць губу і дрэмле на хаду. Аднойчы ў сівушным настроі ён знарок пабіў лямпу ў канторы калгаса. На гэтую калатьню якраз налучыў участковы... «Вясёлага» дзядзьку пасадзілі ў калгасную «Пабеду» і пад аховай міліцыянера адвезлі ў Слуцк. Назаўтра быў суд, які даў бузацёру на цэлы тыдзень добры занятак — падмятаць у горадзе вуліцы.

— А мне і не дрэнна, — цешыў сваё гора дзядзька, — на легкавой машыне ў горад прывезлі! От што значыць добры калгас!

Папрактыкаваўшыся ў Слуцку з мятлой у руках, гэты дзядзька пасля на хрысцінах у суседа піў толькі агурковы расол.

Ва ўсіх жа астатніх калгаснікаў добры, святочны настрой. Ім не прыдзецца высвістваць сумныя песні, як гэта днямі рабіў начны вартаўнік, ці даваць зарок адведаць у свята толькі газіраванай вады.

Перад святам кожны вечар у калгасным клубе да позняга часу гарэлі агні. А на навагоднім вечары драматычны гурток паказаў аднаактовую п'есу, хор калгаса спяваў новыя песні, выступалі дэкламатары, танцоры... А потым — шырай круг! — танцы, танцы!

І калі б вы ў любога калгасніка нават у той святочны вечар, далёкі ад гаспадарчых клопатаў, запыталі: «За што ваш калгас змагаецца ў 1958 годзе?», то, пэўна, атрымалі б вычарпальны адказ. Вам расказалі б, што калгас імя Калініна сёлета абавязаўся атрымаць з аднаго гектара ў сярэднім па 18 цэнтнераў збожжавых, па 7,5 цэнтнера ільнасемя і валакна, на сто гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў — па 268 цэнтнераў малака, 40 цэнтнераў мяса, у тым ліку на сто гектараў ворыва—па 60 цэнтнераў свініны..

Старшыня Сяргей Сямёнавіч падрабязна расказаў бы, якія задачы трэба выканаць калгасу ў гэтым годзе: далейшае паляпшэнне таварнасці грамадскіх ферм, паляпшэнне ўрадлівасці палёў і лугоў, павелічэнне грашовага прыбытку ад шматлікіх другарадных галін гаспадаркі.. У заключэнне старшыня пэўна паўтарыў бы словы, якія мне давялося чуць ад яго разы са два:

— Жыццё, наогул, гэта цудоўнае гарэнне. А ты, чалавек, стой перад топкай і няспынна шуруй і шуруй, каб не згасала і яшчэ лепш разгаралася гэтае прыгожае полымя!

Радасна бачыць, што людзі ідуць у заўтрашні дзень не навобмацак, а па добра асветленай дарозе да велічных задач. І ніхто не сумняваецца, што сёлетні год будзе яшчэ больш шчодры за свайго папярэдніка на радасць, шчасце працоўнаму чалавеку.

Творы самадзейнага кампазітара

Вёска Кошуна Камунараўскага сельсавета на Любаншчыне. Клуб перапоўнены. Ідзе чарговы канцэрт мастацкай самадзейнасці. Узнімаецца заслона і на сцэне—хор. Пранікнёна гучаць словы песні «Нас, маладых, кліча прастора».

Песня падабаецца слухачам. Тэкст яе напісаў мясцовы паэт Іван Муравейка, а музыку,—самадзейны кампазітар, выкладчык спеваў у Любанскай сярэдняй школе № 1 П. Якавенка.

Яго песні выконваюць многія харавыя калектывы калгасаў і дамоў культуры Любанскага, Слуцкага і Старобінскага раёнаў.

Беларускае дзяржаўнае выдавецтва выпусціла зборнік «Песні». У яго ўвайшлі таксама песні самадзейнага кампазітара Паўла Якавенкі.

А. ГОУХМАН.

СПЕКТАКЛІ ТЭАТРА ЛЯЛЕК

У гарадах, раённых цэнтрах і сельскай мясцовасці Віцебшчыны гастраляваў Дзяржаўны тэатр лялек БССР.

Артысты паказвалі юным гледачам — вучням малодшых класаў, выхаванцам дзіцячых дамоў і дзіцячых садоў новую работу, прысвечаную саракавой гадавіне Кастрычніка.

П'еса-казка Тудароўскай і Мятальнікава «Птушынае малако»—добры юбілейны падарунак дзецям.

Пасля Оршы, дзе артысты далі шэсць спектакляў, тэатр выступаў у Дубровенскім раённым Доме культуры. Тэатр даў спектакль вучням Зарубскай сярэдняй школы.

А. МАЦЫЛЕВІЧ.

Па слядах нашых выступленняў

„Улічваць запатрабаванні чытачоў"

У змешчаным пад такім загалоўкам пісьме («Літаратура і мастацтва» ад 14 снежня 1957 г.) гаварылася аб неабходнасці знаёміць чытачоў з біяграфіямі аўтараў новых нарысаў і апавяданняў, якія выдаюцца асобнымі кніжкамі. Як паведаміў рэдакцыі галоўны рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР Я. Казека, пісьмо абмеркавана на нарадзе супрацоўнікаў рэдакцыі мастацкай літаратуры. Заўвагі аўтара пісьма вельмі слушныя, і выдавецтва ўлічыць іх пры выпуску кніг. У прыватнасці, у кожнай кніжцы з «Бібліятэчкі беларускага апавядання і нарыса», выданне якой будзе працягнута сёлета, мяркуецца даваць кароткую бібліяграфічную даведку пра аўтара. Такія ж даведкі будуць змяшчацца таксама ва ўсіх першых кніжках маладых паэтаў, празаікаў і драматургаў.

Часопісы ў 1958 годзе

„Маладосць"

Нашы планы на 1958 год такія: будзем яшчэ больш актыўна працаваць з маладымі аўтарамі і змяшчаць на старонках часопіса лепшыя іх творы. Будзем змяшчаць таксама творы ўжо немаладых аўтараў і нават шырока вядомых, абы толькі іх творы былі напісаны на маладзёжныя тэмы.

Канкрэтна ж мяркуем змясціць у бліжэйшых нумарах новы раман Антона Алешкі аб гераічных буднях лётчыкаў нашай арміі, аповесць Алеся Асіпенкі аб маладых жывёлаводах, аповесць Язэпа Сяміжонава пра сувораўцаў, новыя апавяданні Івана Науменкі, Васіля Быкава, Алеся Савіцкага, Віктара Дайліды, Барыса Сачанкі. Заканчвае новую аповесць для часопіса і аўтар гэтых радкоў.

З драматургіі будзе змешчана п'еса маладога драматурга Івана Козела «Папараць-кветка», а таксама новая п'еса Івана Мележа, прысвечаная саракагоддзю БССР. У партфелі рэдакцыі ёсць яшчэ некалькі новых п'ес.

Вершаў у рэдакцыі вельмі многа, і ўсе яны пераважна маладых аўтараў. Будзем змяшчаць іх падборкамі і пасобку. Падрыхтавана да друку невялікая паэма Міколы Арочкі.

Аднак не толькі гэтыя тры жанры будуць гаспадарыць у часопісе. Як і да гэтага часу, будзе аддавацца належная ўвага мастацкаму нарысу, гумарэсцы, фельетону, байцы, песні, аднаактоўкам для мастацкай самадзейнасці.

У новым годзе застануцца ў нас некаторыя старыя раздзелы і рубрыкі, але будуць уведзены і некаторыя новыя. Плануем мы раздзел «Насустрач саракагоддзю ВЛКСМ», дзе будзем змяшчаць найбольш цікавыя і каштоўныя матэрыялы аб слаўным шляху Ленінскага камсамола. Распрацаваны перспектыўны план азнаямлення нашай моладзі з культурнымі здабыткамі народа, пачынаючы з далёкіх мінулых часоў і да нашых дзён. Сістэматычна будуць весціся раздзелы «У свеце мастацтваў», «Партызанскія сцежкі», «Так яны жывуць», «Навука і тэхніка» і іншыя. Значнае месца будзе адводзіцца цікавым і змястоўным матэрыялам на атэістычныя і палітвыхаваўчыя тэмы.

Афармленне будзе больш разнастайнае і лепшае па мастацкаму выкананню.

Да кожнага нумара будуць бясплатна дадавацца два лісты з рознымі парадамі маладым тэхнікам, канструктарам, швачкам, вышывальшчыцам, мадэлістам.

Аляксей КУЛАКОЎСКІ,
галоўны рэдактар часопіса «Маладосць».

Цікавае знаёмства

Смешнае бачаць усе. Высмейваць умеюць нямногія. Простая канстатацыя таго, што выходзіць за межы агульнапрынятага сваёй дасціпнасцю,—яшчэ не з'яўляецца ні сатырай, ні гумарам. Агульнавядома, што байка—гэта маленькая камедыя, у якой выступаюць жывыя або адухоўленыя дзеючыя асобы. Яна вымагае асаблівай напружанасці сюжэта, дынамічнасці, дакладнасці рэплік дзеючых асоб, выразнай маралі. Сітуацыя бывае камічнай, калі яна ўзгадняецца з характарамі дзеючых асоб, а мараль запамінаецца тады, калі яна афарыстычная, як прымаўка, і арганічна вынікае з твора.

У шостай кніжцы бібліятэкі «Вожыка» за гэты год змешчаны творы васемнаццаці маладых сатырыкаў і гумарыстаў рэспублікі. Байкі «Свіння пад сядлом» Цімоха Карагі, «Паляўнічы» Івана Гурбана, «Мядзьведзь і каза» Сямёна Аляхновіча, у якіх высмейваецца фанабэрыстасць, зайздроснасць, патуранне дрэнным работнікам, — узнімаюць некаторыя актуальныя пытанні нашага жыцця. Аўтарам гэтых твораў уласцівы гумар, трапнасць назіранняў, вобразнасць мовы. Але далёка не ўсе байкапісцы, прадстаўленыя ў зборніку, у дастатковай меры асвоілі жанр байкі. Прамалінейнасць вывадаў, замаруджанасць дзеяння адчуваецца ў байках «Ігнат і бюракрат» Міколы Каралёва, «Перадавік» і «Леў-бюракрат» Уладзіміра Антуськова і ў іншых. Сапраўды, у байцы «Перадавік» такая мараль: «Другі ў нас тым перадавік, што вельмі лёгкі на язык»; у байцы «Ігнат і бюракрат»—мараль: «Чаму ж не памагла заява, якую напісаў Ігнат? Яе трымае бюракрат» і г. д. Дарэчы, у апошняй байцы гэтага бюракрата можна ўбачыць толькі на ілюстрацыі, а не ў самім творы. Тое ж самае можна сказаць і аб іншых персанажах, якія толькі названы ці ў загалоўку, ці ў тэксце, але зусім не выяўляюць сваёй сутнасці ў дзеянні. Відавочна, маладым байкапісцам неабходна лепш асвойваць выбраны жанр, настойліва вучыцца ў выдатных майстроў байкі—рускай і беларускай, больш улічваць спецыфіку жанра. Васіль Маеўскі называе свой твор «Падлічыў» байкай, хоць на самай справе гэта вершаваны фельетон (дарэчы, удалы).

Гумарыстычныя вершы таксама шырока прадстаўлены ў зборніку. Вылучаюцца свежасцю тэматыкі, трапнымі дэталямі «Аб чым дрэвы гаманілі», «Перавёз» Марата Ханяка, «Сціплы гусак» Івана Сяркова, «Апанас» Віктара Шымука. Але ёсць сярод іх і фальшывыя, напрыклад, «Шчотка» Алеся Кузняцова. Аўтар прымушае нейкага дзеда купляць сваёй бяззубай бабулі... зубную шчотку на той падставе, што дзед не мог утрымацца ад спакусы:

Бачыў: людзі бралі ў краме,
Ну, і я купіў таксама.

Можна было б палічыць гэта за жарт, хоць і не вельмі дасціпны, каб аўтар не рабіў такога нечаканага павароту:

Шмат у нас кіраўнікоў,
Шмат у нас планавікоў,
Што на вецер трацяць сродкі,
Як дзядуля той на шчоткі.

Вядома, аб безгаспадарчым выдаткаванні дзяржаўных сродкаў трэба пісаць, і вывад аўтара не выклікаў бы непаразумення, калі б ён быў папярэдне падрыхтаваны зместам твора. Бяда, што аўтар пераблытаў праўдзівае і няпраўдападобнае, і твор таму траціць пераканальнасць, успрыймаецца, як надуманы, штучны і, відавочна, ніякіх падстаў называцца сатырычным не мае.

Здзіўляе таксама сваёй «эстраднасцю», у самым горшым сэнсе слова, верш «На прычэпе» Васіля Лук'янчыка:

Слава хутка разыйшлася
Па аколіцы пра нас...
Трактарыстам — я ў калгасе,
А прычэпшчыцай — яна.
І, калі — я не заўважыў —
У сэрца мне яна ўвайшла (?)
І, як жартам хлопцы кажуць,
На прычэп мяне ўзяла... (?).

. . . .

А сады — куды ўжо лепей
Упрыгожыла вясна!
Я не знаю, на прычэпе
Хто з нас: я або яна?

Верш выклікае не ўсмешку, а здзіўленне. Толькі пры элементарнай непатрабавальнасці, адсутнасці густу можна так пісаць пра каханне. Як відаць, фактура верша таксама слабая: прыблізная рыфмоўка (заўважыў — кажуць, цягне — адвагі), заблытаныя інверсіі («сказаць — няма адвагі пару слоў ёй дарагіх» і «сады — куды ўжо лепей упрыгожыла вясна»). Відавочна, аўтар пісаў свой твор з добрымі намерамі, але атрымалася зусім адваротнае таму, што ён хацеў. бо яму не ўдалося знайсці адпаведныя задуме мастацкія сродкі. Гэта гаворыцца не для таго, каб папракнуць пачынаючага паэта, а з жаданнем дапамагчы яму разабрацца ў прычынах яго няўдачы.

Добрае ўражанне пакідаюць сатырычныя апавяданні, у якіх выводзяцца каларытныя тыпы розных несумленных людзей: шкурніка ў «Крыўдзе» Івана Аношкіна, прыстасаванца ў «Бацькавай назіральнасці» Яўгена Каршукова, п'яніцы ў «Зайцы і лібералe» Анатоля Дзялендзіка. Асабліва радуе апавяданне «Ход канём» Васіля Быкава. Аўтар умее заінтрыгаваць чытача, натуральна падвесці да нечаканай, хоць і заканамернай развязкі. Сюжэт апавядання просты. Старшыня арцелі «Вострая шпілька» Кузьма Кузьміч акружыў сябе падхалімамі, якія па рэцэптах начальніка... «крытыкуюць» яго. На справаздачным сходзе адзін з хаўруснікаў Кузьмы Кузьміча па цёмных справах, не разабраўшыся ў інсцэніраваным спектаклі і думаючы, што яго сапраўды выкрылі, расказаў аб махінацыях свайго начальніка і яго даверaных, каб выкруціцца самому.

Безумоўна, недахопы не могуць засланіць сапраўды добрага, што ёсць у зборніку «Давайце знаёміцца». Знаёмства атрымалася цікавым. Яно абнадзейвае, што ў бліжэйшы час беларуская сатыра ўзбагаціцца новымі творчымі здабыткамі. Трэба ўсяляк вітаць ініцыятыву рэдакцыі «Вожыка», якая з сапраўднай увагай паставілася да маладых гумарыстаў і сатырыкаў, выдаўшы кніжку іх твораў. Пачынанне «Вожыка» наводзіць на думку, а ці нельга арганізаваць выпуск падобных (не толькі сатырычных) бібліятэчак пры часопісах «Беларусь» і «Маладосць». Не чакаючы, пакуль у здольных пачынаючых аўтараў збярэцца кніжка вершаў або апавяданняў, можна друкаваць іх творы ў зборніках накшталт «Давайце знаёміцца».

Гэтая справа цалкам апраўдала б сябе, і над ёй варта падумаць.

Сцяпан ГАЎРУСЁЎ.

Калі да нас прыедуць артысты?

З кожным годам змяняецца аблічча вёскі Малінаўка—цэнтра сельгасарцелі «Камінтэрн» у Халмянскім сельскім Савеце Чэрыкаўскага раёна. Паляпшаецца матэрыяльны дабрабыт і культурны ўзровень калгаснікаў. Радасць і дастатак прыйшлі ў іхнія хаты. Культурным і заможным стала іх жыццё. Сельскі клуб мае глядзельную залу, добрую сцэну для выступленняў калектываў мастацкай самадзейнасці, чытальную залу.

На вялікі жаль, тут вельмі рэдка бывае з канцэртамі агітбрыгада раённага Дома культуры.

А самае галоўнае, што мясцовыя жыхары вельмі хочуць, пабачыць на клубнай сцэне п'есы савецкіх драматургаў у выкананні артыстаў-прафесіяналаў.

Між тым тэатры часта робяць выязныя спектаклі. Але не ўсе сельскія пункты ахопліваюцца гэтымі выяздамі. Часцей артысты выязджаюць у буйнейшыя раённыя цэнтры і гарадскія пасёлкі.

Пажадана, каб да нас у сельскі клуб прыехалі з канцэртнай праграмай артысты Бабруйскага перасоўнага тэатра, або артысты Беларускай дзяржаўнай эстрады.

Чакаем вас, таварышы артысты!

Калгаснікі: Я. КРАЎЦОЎ, Г. КАСТРОЎСКАЯ, Я. КУДРАЎЦАЎ, І. ЛЕОНЕНКА, В. АРЦЕМЕНКА, З. КРАЎЦОВА, Н. АРЦЕМЕНКА, З. ЛЕОНЕНКА, М. ДУДАРАВА.

Чэрыкаўскі раён.

Творчыя партрэты

Удумлівы мастак

«...Цяжкае дзяцінства мне выпала на долю!»—гэтымі сумнымі словамі паэта народны артыст рэспублікі Цімафей Мікалаевіч Сяргейчык мог-бы пачаць апавяданне аб сваім жыцці. Дзяцінства яго прайшло ў вялікай сялянскай сям'і, у якой кожны кавалак хлеба на ўліку, бо дзевяцера малых дзяцей не мог пракарміць бацька — адзіны работнік на дзесяціне зямлі. Горкая, безвыходная галеча, звычайная для малазямельнага беларускага селяніна!

Да чатырнаццаці год Цімафей Сяргейчык дапамагае сям'і ў яе беднай гаспадарцы, а затым ідзе ў падзёншчыкі і пастухі ў панскі маёнтак. Ён разам з бацькам становіцца кармільцам. Зімой жа яму ўдаецца наведваць сельскае двухкласнае вучылішча, а з часам і настаўніцкую семінарыю. Магчыма, адукацыя будучага народнага артыста і закончылася б на гэтым, калі б не Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, якая накіравала свабодную чалавечую энергію на будаўніцтва новага жыцця.

Калі пачалася грамадзянская вайна, беларускі хлопец Цімафей Сяргейчык разам з другімі становіцца на абарону заваёў рэвалюцыі. У арміі ён удзельнічае ў чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці, пачынае ўсведамляць сваё сапраўднае прызванне — сцэну, а пасля дэмабілізацыі паступае ў Беларускую драматычную студыю ў Маскве.

Пастаянная сувязь з выдатнымі майстрамі рускага тэатра — выкладчыкамі студыі, спектаклі Мастацкага і Малога тэатраў стварылі спрыяльную глебу для ўзбагачэння ведамі і нагляднымі прыкладамі будучага артыста, сфармавалі яго мастацкі густ. Цімафей Сяргейчык ужо ў тыя гады выяўляе сваю выключную працаздольнасць.

У 1926 г. у Віцебску з выхаванцаў студыі арганізоўваецца Дзяржаўны беларускі тэатр. З таго часу да сённяшняга дня Цімафей Мікалаевіч працуе ў родным тэатры, з'яўляючыся яго вядучым акцёрам.

Ім сыграна больш ста роляў, якія сведчаць аб надзвычай разнастайным творчым дыяпазоне артыста. Сяргейчык заўсёды верны сваёй асноўнай тэме — ўвасабленню вобраза простага чалавека. З сотні сыграных ролей больш палавіны прыпадае на вобразы савецкіх людзей з усімі ўласцівымі ім станоўчымі якасцямі. Артыст іграе гэтыя ролі праўдзіва, з вялікай чалавечай цеплынёй і любоўю. За звычайнай штодзённасцю вобраза ў яго выкананні заўсёды адчуваецца вялікая думка, вялікае сэрца савецкага чалавека. Такі стары ўрач, бацька Вары ў п'есе «Адна», бухгалтар Шароў у п'есе «Яе сябры», Кудроў у п'есе «Блізкае», доктар Чайка ў п'есе «Песня нашых сэрцаў» і многія іншыя. Агульная рыса, якая аб'ядноўвае гэтыя вобразы, — сумленнасць, высокае разуменне абавязку, імкненне да лепшага.

Гаворачы аб ролях, сыграных Сяргейчыкам, трэба адразу сказаць, што спецыфічна тэатральнае слова «роля» ніяк не стасуецца да творчасці Цімафея Мікалаевіча, якая насычана сапраўдным жыццём. Ён заўсёды жыве ў «акалічнасцях, якія прапануюцца», сапраўдным жыццём. І гледачы даруюць Сяргейчыку некалькі глухаваты голас і некаторую напружанасць рухаў. Іх хвалюе праўда «жыцця чалавечага духу», якая выяўляецца артыстам у любой ролі.

Непаўторнасць — адзін з істотных бакоў творчасці Сяргейчыка. У кожную ролю ён уносіць нешта новае. Неабходна адзначыць уласцівае артысту майстэрства дэталі. У працэсе рэпетыцый і пошукаў дакладнай формы Сяргейчык вельмі вынаходлівы, хоць да прэм'еры пакідае са знойдзенага толькі тыя дэталі, характэрныя рысы, прыкметы часу і побыту, якія неабходны для мастацкай закончанасці ролі.

Сцэнічныя прыёмы яго амаль беспамылковыя. Калі што-небудзь іншы раз «не атрымліваецца» ў задуманым, дык не ад недахопу майстэрства, а ад таго, што драматург не даў артысту дастатковы літаратурны матэрыял для паўнацэннага вобраза. Шлях да яго ў Сяргейчыка поўны напружанай акцёрскай працы. Па сшытку любой яго ролі лёгка прасачыць увесь творчы працэс. Ён зафіксаваны ў выглядзе зусім дакладных задач, якія вызначаны па сістэме Станіслаўскага чарцяжамі, схемамі, іканаграфічным і даведачным матэрыялам. Акцёр ведае ўсё аб персанажы, якога ўвасабляе. У рэпетыцыйнай рабоце для Сяргейчыка важны яе калектыўны пачатак. Ён гранічна ўважлівы да прапаноў рэжысёра і таварышаў. Бліскуча валодаючы «ўнутранымі маналогамі», ён увесь у няспынным дзеянні.

Роля для Цімафея Мікалаевіча — літаратурны матэрыял, які дазваляе стварыць тыповы характар разнастайнымі выяўленчымі акцёрскімі сродкамі, напоўненымі сапраўднымі чалавечымі страсцямі. У кожнай сваёй ролі Сяргейчык вызначае перш-на-перш галоўную думку, ідэйную накіраванасць вобраза. Ён ставіць і вырашае пытанне: у імя якіх ідэйных мэт будзе ствараца вобраз, куды накіроўваецца яго ідэйнае «вастрыё». Прынятае рашэнне становіцца як-бы стрыжнем будучага вобраза, яго грунтоўнай асновай. Так, напрыклад, у ролі князя Абрэзкава ў драме Л. Талстога «Жывы труп» за знешняй прыстойнасцю князя Сяргейчык у сцэнічных паводзінах, у інтанацыях, у адносінах да людзей, у падкрэсленай грэблівасці да Пратасава дае закончаны, па-талстоўску праўдзівы, вобраз ханжы, двудушніка, халоднага, жорсткага себялюбца. Сацыяльна вострa таксама сыграна ім роля настаўніка гімназіі Кулыгіна ў чэхаўскай п'есе «Тры сястры» — тып «чалавека ў футляры». Рысамі асуджанасці адзначаны ў выкананні Сяргейчыка вобраз Бардзіна («Ворагі» Горкага). Страшны сваёй бесчалавечнасцю пракурор Няклюдаў («Сям'я» Папова) і інш. Бязлітасным абвінаваўцам старога свету выступае Сяргейчык, ствараючы гэтыя ролі на высокім ідэйным і мастацкім узроўні.

Такі падыход да сцэнічнага вырашэння вобраза ў Сяргейчыка і ў ролях камедыйнага плану. Сатырычнай накіраванасцю характэрныя створаныя ім вобразы Кучумава («Шалёныя грошы»), Осіпа («Рэвізор») і асабліва шкаляра Самахвальскага («Несцерка»). За цудоўнае выкананне гэтай ролі Цімафей Мікалаевіч удастоены звання лаўрэата Сталінскай прэміі.

Вялікі ўклад унесены артыстам у родную беларускую драматургію. Ён добра ведае, адчувае і перадае родную мову і нацыянальны характар, бо з вычарпальнай паўнатой вывучае народнае жыццё, асабліва мінулае свайго народа. Вобразы, створаныя Сяргейчыкам у п'есах беларускіх драматургаў, — гэта перш за ўсё глыбока народныя характары, адзначаныя вялікай чалавечай цеплынёй і псіхалагічнай дакладнасцю жыццёвых паводзін.

Кожная з пастаўленых на сцэне тэатра імя Якуба Коласа беларускіх п'ес абавязкова ішла з удзелам у ёй Ц. Сяргейчыка. Тут трэба адзначыць Саўку («У пушчах Палесся») і дзеда Астапа («Вайна—вайне») — у п'есах Якуба Коласа. Артыст пранікнёна авалодаў коласаўскімі вобразамі іх цудоўнай мовай. Народнасць, уласцівая Якубу Коласу, раскрыта ў гэтых сцэнічных вобразах з вялікай мастацкай пераканальнасцю, сацыяльнай праўдай і паэтычным успрыняццем творчасці нашага вялікага народнага пісьменніка.

Гэтымі ж рысамі вызначаюцца ў Сяргейчыка сыграныя ім ролі Азорыча ў п'есе «Над Бярозай-ракой» П. Глебкі, у п'есах В. Палескага, у п'есе «Машэка» В. Вольскага (дзед Рабіна). У апошняй ролі, не парушаючы праўды побыту, артыст знаходзіць своеасаблівае рамантычнае гучанне, якое вынікае з легендарнага сюжэта «Машэкі».

Назіранні артыстам народнага жыцця, а таксама асабіста перажытае і адчутае, дазволілі яму стварыць тыповы, абагулены вобраз беларускага селяніна-беззямельніка Лявона Зябліка ў драме Янкі Купалы «Раскіданае гняздо». З трагічнай сілай праводзіць Сяргейчык усю ролю, падкрэсліваючы яе актыўны пачатак пратэстам супраць галечы і панскага свавольства. У Лявоне Зябліку паказаны чалавек, які зламаны цёмнай сілай, але не здаўся ёй і сваёй смерцю кліча сына на далейшую барацьбу за лепшую долю.

Дзейнасць Цімафея Мікалаевіча не абмяжоўваецца толькі акцёрскай работай. З поспехам ён працуе ў рэжысуры, паставіўшы на сцэне тэатра імя Якуба Коласа такія значныя п'есы, як «Ірынка» К. Чорнага, «Дзеці Ванюшына» Найдзёнава і рад іншых. У рэжысуры асабліва ярка выяўляюцца моцныя бакі творчасці Сяргейчыка: схільнасць да глыбокага аналізу, псіхалагічнасці, праўды жыцця, да закончанай мастацкай формы, якая дакладна выказвае асноўную думку пастаноўкі, яе ідэйную накіраванасць.

Так, у спектаклі «Дзеці Ванюшына» рэжысёрам, побач з выдатна раскрытай праўдай купецкага побыту, была глыбока распрацавана тэма бацькоў і дзяцей, распаду буржуазнай сям'і. Псіхалагічна правільна паказаны драматычныя сутыкненні персанажаў п'есы, у якой рэжысёр здолеў «сямейную» праблему ўзняць да вышынь сацыяльнага абагульнення.

Творчы партрэт Сяргейчыка быў бы няпоўным, калі б мы не ўспомнілі яшчэ аб адным баку яго дзейнасці — педагагічным. Больш дваццаці год ён выкладае майстэрства акцёра тэатральнай моладзі. Многія з сучасных вядучых артыстаў тэатра імя Якуба Коласа — яго вучні. Ён не толькі вучыць майстэрству, але і выхоўвае пачуццё высокай патрабавальнасці да сябе.

Педагогу Сяргейчыку ўласціва ўменне знайсці ключ да разумення творчай індывідуальнасці вучня і выклікаць улюбёнасць у свой прадмет. Дасканалае яго веданне, заснаванае на арганічным спалучэнні элементаў сістэмы Станіслаўскага з уласным багатым сцэнічным вопытам і творчай практыкай тэатра імя Якуба Коласа, дае трывалыя веды моладзі.

Урокі Сяргейчыка ў драматычнай студыі пры тэатры напоўнены захапляючымі тлумачэннямі асноў майстэрства і наглядным паказам. Свой больш чым трыццацігадовы сцэнічны вопыт і веды ён, як эстафету, перадае малодшаму пакаленню коласаўцаў, выхоўваючы з іх патрабавальных мастакоў, людзей натхнёнай працы.

Ведучы вялікую грамадскую работу як дэпутат Віцебскага абласнога Савета, Ц. Сяргейчык удзяляе многа ўвагі і сіл мастацкай самадзейнасці, асабліва сельскай. Ён выязджае для кансультацый і правядзення рэпетыцый у раёны вобласці.

Выхаваны партыяй, глыбока адданы народу і беларускаму савецкаму тэатральнаму мастацтву, ён жыве актыўным творчым жыццём, напоўненым не толькі працай, але і марамі, шырокімі планамі на будучае. Ён марыць сыграць блізкі яму вобраз сучаснага простага чалавека, які прайшоў складаны жыццёвы шлях праз рэвалюцыю, грамадзянскую вайну, часы пяцігодак, барацьбу і перамогу над фашызмам. Хочацца яму паказаць жыццё свайго сучасніка, які нарадзіўся ў канцы дзевятнаццатага стагоддзя, пражыў складаны перыяд нашага часу і ўступіў у новую эру чалавецтва — эру вялікіх адкрыццяў, перамогі чалавечага розуму над цемрашальствам. Цімафей Мікалаевіч чакае ад драматургаў такога вобраза героя нашага часу. Ва ўвасабленні яго на сцэне артыст бачыць галоўную мэту і задачу нашага тэатральнага мастацтва.

А. СКІБНЕЎСКІ,
заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

Віцебск.

„За нашу і вашу свабоду“

У мінулым годзе Таварыства польска-савецкай дружбы запрасіла да сябе ў госці групу відных савецкіх кіраўнікоў партызанскага руху. Вынікам гэтага з'явіўся выхад у свет нарыса «Пасля трынаццаці гадоў...» *) у апрацоўцы Анджэя Чарвінскага. Кніга выйшла пад № 4 у бібліятэчцы Таварыства польска-савецкай дружбы. У падзагалоўку значыцца: «Спатканне з былымі савецкімі партызанамі—таварышамі з поля бою». Так, гэтая невялічкая кніжка расказвае аб агульнай барацьбе, аб дружбе, замацаванай крывёю змагароў супраць фашызма.

Са старонак кнігі вее гісторыяй. Але гэтая гісторыя — жывое ўвасабленне баявых спраў такіх людзей, як Мікола Пракапюк, Пятро Брайко, Іван Банаў, Віктар Карасёў, Юзаф Сабясяк, Станіслаў Вронскі і дзесяткі тысяч іншых савецкіх і польскіх патрыётаў.

Героі нарыса самі расказваюць аб сабе. Аўтар толькі надае цэласнасць разрозненым апавяданням.

Вось перад намі жыццёвы шлях Героя Савецкага Саюза палкоўніка Міколы Пракапюка. Украінскі слесар, ён адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўступае ў рады Чырвонай гвардыі і «аж да поўнай перамогі краіны Саветаў змагаецца на многіх франтах і ў розных раёнах Савецкага Саюза». У 1937 г. ён добраахвотна паехаў у Іспанію, дзе ўзначаліў 14-ты партызанскі корпус і вёў барацьбу супраць франкістаў і нямецка-італьянскіх інтэрвентаў. Савецкае камандаванне ў 1942 г. даручыла яму арганізацыю партызанскага руху ў глыбокім тыле ворага—у раёне Сарнаў, Луцка і Ковеля. А калі Савецкая Армія ў сваім пераможным наступленні дайшла і да гэтых раёнаў, то партызаны Пракапюка атрымалі загад перабазіравацца на тэрыторыю Польшчы, каб працягваць барацьбу.

У нарысе прыводзіцца многа цікавых прыкладаў, якія сведчаць аб дружбе і братэрстве польскіх патрыётаў і савецкіх партызан. Аднойчы цяжка быў паранены партызан Пятро Анціпаў. Адвезці яго на самалёце на «вялікую зямлю» не прадстаўлялася магчымым. І, даведаўшыся аб гэтым, сяляне вёскі Далячкова (Уладаўскага павету) прапанавалі сваю дапамогу. Разам з Анціпавым у вёсцы была пакінута медсястра Раіса Заўгародняя і яны шчасліва дачакаліся тут прыходу Савецкай Арміі.

А вось яшчэ адзін факт, пра які ў нарысе расказвае Герой Савецкага Саюза Пятро Аляксеевіч Брайко: «Аднаго разу — было гэта, памятаю, у раёне Сталёвай Волі—далажылі мне, што нашы вартавыя затрымалі асобу, якая абавязкова хоча бачыць «самога камандзіра». І праз хвіліну да мяне прывялі маладзенькую польскую дзяўчынку, якой было не больш 15 гадоў.

Спачатку яна пахваліла добрую ўзброенасць нашых салдат, а потым, пераканаўшыся, што сапраўды размаўляе з «самім камандзірам», дастала невялікі кавалак паперы, які быў старанна схаваны пад ваўнянай хусткай. Я паглядзеў і вачам сваім не паверыў. На паперы было намалявана размяшчэнне нямецкіх гарнізонаў у раёне Сталёвай Волі... Няўмела, па-дзіцячаму былі адзначаны на ім пазіцыі фашыстаў, склады, умацаванні...».

Адным з выдатнейшых камандзіраў партызанскага руху, якія дзейнічалі на тэрыторыі Польшчы, быў Герой Савецкага Саюза Віктар Карасёў. Да гэтага часу з любоўю і павагай успамінае яго польскае насельніцтва ў раёнах Білгорая, Янава і Замосця. У 1941 г. пад Масквой, выконваючы загад Савецкага камандавання, Карасёў арганізаваў у тыле ворага моцны партызанскі атрад і смелым начным налётам дашчэнту разбіў штаб XII корпуса цэнтральнай арміі групы нямецкіх войск.

За гэтую смелую аперацыю маёр Карасёў быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

Рушыўшы глыбокім рэйдам у кірунку на Смаленск, атрад імя Аляксандра Неўскага пад камандаваннем Карасёва дайшоў да Беларусі, дзе ўпісаў не адну старонку ў гераічны летапіс партызанскага руху.

На польскую зямлю партызаны атрада імя Аляксандра Неўскага ступілі, маючы за сабой багаты вопыт партызанскіх баёў, з якіх яны заўсёды выходзілі пераможцамі. У хуткім часе атрад стаў расці за кошт польскага папаўнення. Нямала польскіх патрыётаў загінула потым, змагаючыся поплеч з савецкімі партызанамі супраць агульнага ворага. Вось паляк Драгамірэцкі, мужны салдат. Загінуў у баях з немцамі на ўкраінскай зямлі. Вось Боцян, намеснік начальніка штаба атрада. Ён таксама загінуў смерцю адважных. З асаблівай сардэчнасцю, цеплынёй і сімпатыяй успамінае Карасёў трох братоў Вронскіх: Станіслава, Балеслава і Юзафа. «Іх гісторыя, пра якую нам расказаў тав. Карасёў, — жывы прыклад польска-савецкага братэрства па зброі, дружбы і ўзаемнай дапамогі»,—гаворыць аўтар нарыса.

Адзін брат, Юзаф, загінуў смерцю героя ў Карпатах, прыкрываючы з групкай партызан адступленне ўсёй групіроўкі.

Другі брат, Балеслаў, праславіўся як бясстрашны разведчык. Не дарма менавіта яму было дадзена адказнае заданне — забіць ката польскага народа, «генеральнага губернатара» Ганса Франка.

Малодшы, Станіслаў, у мінулым шахцёр Дамброўскага басейна. У 1939 г., уцякаючы ад нямецкіх фашыстаў, ён перабраўся з сям'ёй на тэрыторыю Заходняй Украіны, дзе знайшоў гасцінны прыём і добрую працу. У 1942 г. ён наладжвае кантакт з атрадам «Дзядзі Пеці», потым змагаецца ў брыгадзе генерала Фёдарава. Разам з атрадам Карасёва ён трапляе на родную зямлю. У хуткім часе становіцца начальнікам разведкі, а потым і намеснікам камандзіра атрада.

Будучы ў Польшчы, Віктар Карасёў сустрэўся са сваім баявым таварышам Станіславам Вронскім. Нельга чытаць без глыбокага хвалявання радкі, у якіх апісваецца сустрэча двух баявых сяброў.

Гаворачы аб дружбе савецкіх і польскіх партызан, варта ўспомніць і яшчэ пра аднаго польскага патрыёта, пра якога і сёння з удзячнасцю ўспамінаюць дзесяткі тысяч людзей на Палессі, на Валыні і на Келяччыне. Гэта — Юзаф Сабясяк («Макс»)—камандзір польскага партызанскага атрада, кавалер Крыжа Віртуці Мілітары і ордэна Леніна. Складаны і цяжкі жыццёвы шлях прайшоў Юзаф Сабясяк. Па прафесіі слесар, ён у 1939 г. радавым польскай арміі біўся з немцамі і адступаў на ўсход. Так ён апынуўся на савецкай зямлі, знайшоў тут працу і прытулак. А калі немцы прыйшлі ў Ковель, дзе ён жыў, Сабясяк узначаліў арганізаваны сабатаж і дыверсіі на чыгунцы. Ён стварае падпольную друкарню і ў час набору лістовак яго «накрываюць» немцы і ўкраінскія нацыяналісты. Але яму ўдаецца ўцячы. Юзаф стварае партызанскі атрад. У цесным кантакце з савецкімі партызанамі польскі атрад вядзе бязлітасную барацьбу з нямецкімі акупантамі і іх прыхвасцямі. У 1944 г. на вызваленай ад немцаў тэрыторыі быў арганізаваны польскі штаб партызанскага руху, на чале якога стаяў старшыня Дзяржаўнага Савета генерал Аляксандр Завадскі. У Любліне створаны Камітэт народнага вызвалення. У жыцці «Макса» настае радасны дзень—яго запрашаюць у Крэмль і ўзнагароджваюць ордэнам Леніна.

Генерал Завадскі дае «Максу» адказнае заданне: сабраць групу ў сто чалавек і як часць Польскай народнай арміі на парашутах высадзіць у Заходняй Польшчы. Гэтае заданне было выканана.

Відныя дзеячы савецкага партызанскага руху, якія гасцілі ў Польшчы, наведалі і свайго слаўнага пабраціма, палкоўніка Юзафа Сабясяка, які сардэчна прывітаў іх у сталіцы народнай Польшчы—Варшаве.

Дружба двух народаў—польскага і савецкага,—якая нарадзілася ў цяжкія дні сумеснай барацьбы з нямецкімі акупантамі, ніколі не згасне. Яна змацавана крывёю лепшых сыноў абодвух народаў. І яна з'яўляецца зарукай іх перамогі ў барацьбе за мір і сацыялізм.

І. СКАПАРАЎ.

---

*) Po trzynastu latach... Варшава, 1957. Бібліятэчка польска-савецкай дружбы.

Карцінная „галерэя“ ў школе

Вучні Лідскай сярэдняй школы № 1 (Гродзенская вобласць) любяць выяўленчае мастацтва. Многія з дзяцей, якія набывалі са сваімі бацькамі ў Маскве, наведалі Трэцякоўскую галерэю.

Школьнікі, якія займаюцца ў гуртку «Умелыя рукі», вырашылі пад кіраўніцтвам настаўніцы чарчэння і малявання Г. Сянкевіч арганізаваць школьную карцінную «галерэю» з рэпрадукцый Трэцякоўскай галерэі. Больш чым для 100 карцін гурткоўцы зрабілі прыгожыя багетныя рамы, зашклілі іх.

На здымку: ініцыятары стварэння школьнай карціннай «галерэі» (злева-направа) — вучні **Андрэй Гіп, Іна Жарабцова,** настаўніца **Г. Сянкевіч** і вучаніца **Валянціна Бяляева** — разглядаюць карціну «Хадакі ў Леніна».

Фота і тэкст Гр. Ткачэнкі.

Гродзенская вобласць.

Майстры народнай творчасці

З году ў год памнажаюцца поспехі мастацкай самадзейнасці рэспублікі. Яе прадстаўнікі паспяхова выступалі на канцэртах, паказвалі свае лепшыя творы на выстаўцы народнай творчасці ў час дэкады беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве (1955).

Добрых вынікаў дамагліся калектывы, майстры народнай творчасці да саракагоддзя Вялікага Кастрычніка. Аб гэтым наглядна сведчылі святочныя канцэрты і спектаклі, новыя песні, створаныя самадзейнымі кампазітарамі, творы ткачых, вышывальшчыц, разбяроў па дрэву і касці, інкрустатараў, самадзейных мастакоў і скульптараў, якія экспанаваліся на юбілейнай рэспубліканскай выстаўцы народнай творчасці ў Мінску.

У 1957 годзе мастацкая самадзейнасць рэспублікі налічвала ў сваіх радах 175 тысяч удзельнікаў, аб'яднаных у 11 500 калектываў.

У канцы снежня мінулага года шматлікія калектывы мастацкай самадзейнасці рэспублікі абляцела радасная вестка. Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР прысвоіў ганаровыя званні майстрам народнай творчасці. Самадзейнаму разбяру па дрэву з Давыд-Гарадка Канстанціну Кандратавічу Казелку прысвоена званне заслужанага дзеяча мастацтваў. Тром іншым прадстаўнікам самадзейнага мастацтва Паўлу Мікалаевічу Касачу—кампазітару, кіраўніку хору калгаса «Першае мая» Нясвіжскага раёна; Браніславе Іванаўне Любовіч—вышывальшчыцы і кіраўніку гуртkоў вышыўкі ў Гродна; Паўлу Іванавічу Шыдлоўскаму—кампазітару, кіраўніку хору Прысынкаўскага сельскага клуба Уздзенскага раёна прысвоены званні заслужанага дзеяча культуры Беларускай ССР.

Іх працоўная і творчая дзейнасць штодзённа звязана з жыццём народа. Казелка—адзін з таленавітых разбяроў па дрэву сярод вялікай групы майстроў, якія адрадзілі і развілі далей гэты старажытны від беларускай творчасці. Сярод сваіх сабратоў па разцу яму ўдалося найбольш поўна ўвабраць у сябе лепшыя традыцыі гэтага традыцыйнага мастацкага рамяства і перайсці, як і яго таварышам, да драўлянай тэматычнай скульптуры. З гадамі ўдасканальвалася яго майстэрства, набываліся новыя веды і навыкі ў галіне выяўленчага мастацтва. Пасля вайны ён пачаў выстаўляць свае работы на абласных і рэспубліканскіх выстаўках народнай творчасці, быў удзельнікам дэкаднай выстаўкі ў Маскве ў 1955 г. Яго работы прыцягвалі ўвагу грамадскасці і атрымлівалі высокую ацэнку. За дасягнутыя поспехі ў развіцці самадзейнага мастацтва

П. Шыдлоўскі

К. Казелка быў узнагароджаны медалем «За працоўную выдатнасць».

Упарта працуючы над сабой, разбяр чула прыслухоўваецца да заўваг вядучых скульптараў і мастакоў рэспублікі, кансультуецца з імі. Ён часта звяртаецца ў сваёй творчасці не толькі да надзённых тэм нашай сучаснасці, але і да гераічнага мінулага нашага народа, да казачных і былінных герояў. Тым самым ён нібы сцвярджае адзіную і непарыўную сувязь паміж рыцарамі зямлі рускай у скульптурах «Рускі багатыр», «Руслан і Рагдай», «Аляксандр Неўскі», «Суворaў», «Тарас Бульба», «Салават Юлаеў» і рыцарамі зямлі савецкай—«Глыбокі рэйд», «Генерал Даватар», «Пархоменка», «Апошні дзень Івана Кузьміна», «Людзі калгасных палёў».

У скульптуры «Руслан і Рагдай» аўтар выключна смелай кампазіцыяй знаходзіць магчымасці выразна паказаць бойку Руслана з лютым Рагдаем. Створаныя ім вобразы дынамічныя, эмацыянальна насычаныя, жыццёва праўдзівыя і выразныя. Яны напоўнены прывабнасцю, фізічнай і душэўнай сілай і прыгажосцю. Гэта сапраўдныя абаронцы інтарэсаў народа, носьбіты яго патаемных думак, перадавыя людзі свайго часу.

Сярод многіх самадзейных кампазітараў рэспублікі П. Шыдлоўскі і П. Касач заслужылі агульную павагу і любоў сваімі шматлікімі лірычнымі, задушэўнымі і жыццерадаснымі песнямі, сугучнымі душы народа.

П. Шыдлоўскі вось ужо каля дваццаці год працуе ў сельскіх культасветустановах, ні на адзін дзень не парываючы сувязі з мясцовым калгасам. Пачаўшы сваю дзейнасць у хаце-чытальні, ён цяпер працуе загадчыкам сельскага клуба ў вёсцы Прысынкі Уздзенскага раёна Мінскай вобласці.

Творчая і працоўная дзейнасць П. Шыдлоўскага разнастайная і шматгранная, як і яго прафесія. Ён арганізатар культурна-масавай работы сярод калгаснікаў, мастацкай самадзейнасці ў клубе, кіраўнік харавога калектыву, таленавіты стваральнік паэтычных твораў і песеннай народнай музыкі. У гэтай творчай дзейнасці яму актыўна дапамагаюць прафесіянальныя кампазітары і паэты, з якімі ён заўсёды ахвотна раіцца. Музычная і паэтычная творчасць П. Шыдлоўскага разнастайная і разам з тым актуальная па тэматыцы. Яго песні прысвечаны партыі, Радзіме, калгаснай працы, важнейшым падзеям у нашай краіне. Такія песні, як «Прывітальная Маскве», «Родная краіна», «Працавалі дзеванькі», «Чаму хлопец не жанаты» і інш., шырока выконваюцца не толькі самадзейнымі хорамі ў рэспубліцы, але і прафесіянальнымі калектывамі. Шмат песень П. Шыдлоўскі стварыў у выглядзе прыпевак на мясцовым матэрыяле.

Асаблівая каштоўнасць паэтычна-музычнай творчасці кампазітара—у сапраўднай народнасці і жыццёвай праўдзе. Ён умее выкарыстаць лепшыя традыцыйныя інтанацыі і мелодыі ў сучаснай песні. Шчыра і моцна любіць Павел Іванавіч беларускую песню, свой народ і свой родны край і жадае ўсім шчасця ў «Песні аб Беларусі»:

...Нясуцца напевы ў далі.
І чутна Радзіме ўсёй,
Як людзі аб шчасці спяваюць,
Аб партыі роднай сваёй.
У звоне кіпучае працы
Ідуць за гадамі гады;
Квітней, Беларусь дарагая,
Як вёснамі сад малады.

Шчырым і сапраўдным энтузіястам культурнай работы на вёсцы з'яўляецца 70-гадовы педагог, цяпер пенсіянер, самадзейны кампазітар П. Касач. Ён нястомны кіраўнік раду калгасных і школьных хораў, чулы і шчыры таварыш, настаўнік моладзі. Яго хвалюючыя песні, створаныя на аснове народных мелодый на тэксты беларускіх і рускіх паэтаў і на народныя словы, карыстаюцца поспехам у слухачоў.

Шырокую папулярнасць сярод самадзейных і прафесіянальных хораў заваявалі такія яго песні, як «Зацвілі пралескі», «Кланялася жыта», «Ці на поле, ці на луг», «Камар жэніцца стары» і інш.

Шмат папрацаваў Павел Мікалаевіч з хорам калгаса «Першае мая» Нясвіжскага раёна. У выніку яго плённай дзейнасці, любоўнага і ўважлівага выхавання харыстаў-калгаснікаў калектыў стаў адным з вядучых у Мінскай вобласці. Ён паспяхова выступіў перад працоўнымі Мінска ў час Беларускага фестывалю моладзі і, трэба спадзявацца, што і далей будзе ўдасканальваць сваё майстэрства.

Б. Любовіч

Браніслава Іванаўна Любовіч за час сваёй шматгадовай работы ў галіне вышыўкі ў дасканаласці авалодала гэтым складаным майстэрствам. Але яна не замыкаецца ў рамкі індывідуальнай творчасці. Вось ужо некалькі год, як яна паспяхова перадае свой багаты вопыт шматлікім аматарам вышыўкі, кіруе і ўдзельнічае ў стварэнні калектыўных работ.

Хочацца ад усяго сэрца пажадаць нашым заслужаным дзеячам мастацтва і культуры новых творчых поспехаў, шчасця і здароўя.

В. ГАРАЧУН.

ПІСЬМО У РЭДАКЦЫЮ

Аб падручніку па беларускай літаратуры

На працягу пяці год навучання ў МДУ мы вывучалі літаратуры розных народаў—рускую, заходнееўрапейскую, чэшскую, югаслаўскую, польскую і літаратуры народаў СССР—украінскую, азербайджанскую, таджыкскую, беларускую.

Пры вывучэнні заходнееўрапейскай і рускай літаратур мы карысталіся вялікай колькасцю падручнікаў і літаратуразнаўчых работ.

А пры вывучэнні літаратур народаў СССР мы сустрэлі вялікія цяжкасці, таму што па гэтых літаратурах амаль няма падручнікаў і крытычных артыкулаў. У прыватнасці, мы сустрэлі вялікія цяжкасці пры вывучэнні беларускай літаратуры, таму што на рускай мове амаль ніякіх дапаможнікаў па гэтай літаратуры няма.

Творчасць многіх пісьменнікаў і паэтаў народаў СССР выйшла за рамкі сваіх нацыянальных літаратур і набыла сусветнае значэнне. Кожны культурны чалавек нашага часу павінен ведаць гэтых пісьменнікаў, як ён ведае Шэкспіра, Бальзака, Гейнэ. Літаратуры народаў СССР, апроч рускай, слаба вывучаны літаратуразнаўцамі і крытыкамі. У існуючых крытычных артыкулах і манаграфіях не ставяцца важныя тэарэтычныя праблемы, не паказваецца своеасаблівасць і спецыфіка кожнага пісьменніка. Крытыкі разглядаюць творчасць пісьменнікаў народаў СССР пераважна толькі ў рамках нацыянальных літаратур, не паказваючы іх месца ва ўсёй савецкай літаратуры.

Між тым неабходна заўсёды памятаць аб сусветным значэнні савецкай літаратуры і аб тым, што за літаратурай народаў СССР сочыць усё прагрэсіўнае чалавецтва. Прыгадваюцца словы, сказаныя нямецкай пісьменніцай Аннай Зегерс на II-м з'ездзе савецкіх пісьменнікаў. У сваім выступленні яна расказала аб тым, што ў Германіі па кнігі савецкіх пісьменнікаў стаіць большая чарга, чым па хлеб. Трэба стварыць на рускай мове падручнікі па літаратурах народаў СССР, якія глыбока і рознабакова асвятлялі б творчасць пісьменнікаў і служылі б навучальным дапаможнікам пры вывучэнні літаратур народаў СССР. У прыватнасці, па беларускай літаратуры такі падручнік можа быць выдадзены ў самой Беларусі.

Трэба вывучаць не толькі сучасную літаратуру розных народаў, але і старажытную літаратуру і фальклор. Напрыклад, вельмі слаба вывучаны багацейшы беларускі фальклор: не толькі не перавыдаюцца зборнікі фальклору, якія існуюць, але няма глыбока навуковых работ па вуснай народнай творчасці. Думаецца, ва ўсім гэтым беларуская крытыка і літаратуразнаўства маглі б адыграць важную ролю.

Хочацца пажадаць далейшых творчых поспехаў беларускім пісьменнікам і літаратуразнаўцам у стварэнні твораў, вартых нашай слаўнай эпохі.

Г. МІТКОЎ, М. ДУШКОВА (Балгарыя),
П. КІРЫЛАЎ (Румынія),
Ю. АЗІЗХАНАВА (Узбекістан),
АЙТМАГАМБЕТАВА (Казахстан),
студэнты МДУ.

У імя шчасця чалавека

——

Ю. ПШЫРКОЎ

——

Новы раман украінскага пісьменніка Міхайлы Стэльмаха «Кроў людская — не вадзіца»[1] адразу пасля апублікавання стаў любімай кнігай чытачоў незалежна ад таго, хто ўзяў яе ў рукі, украінец, рускі, беларус ці прадстаўнік якой-небудзь іншай нацыянальнасці. Здаецца, многа твораў напісана на мовах народаў Савецкага Саюза аб грамадзянскай вайне, аб барацьбе беднаты з кулацтвам, аб ахвярах лепшых змагароў за агульнае шчасце працаўнікоў вёскі і г. д. А калі нядаўна мы прачыталі раманы П. Ніліна «Жорсткасць», А. Чарнышэвіча «Світанне» і М. Стэльмаха «Кроў людская — не вадзіца», то зусім па-новаму ўсвядомілі барацьбу і перамогі нашых бацькоў, з большай глыбінёй і пранікнёнасцю зразумелі веліч сучаснасці.

М. Стэльмах апавядае пра першыя крокі станаўлення Савецкай улады на Украіне. У невялікім сяле Навабугаўка жыццё стала нагадваць імклівую плынь бурлівай ракі. Бядняки сабраліся ў паўразбураным панскім доме абмеркаваць пытанне аб падзеле кулацкай зямлі, а ў змроку ночы каля вокнаў снавалі цені вясковых кулакоў.

Зямля ўсіх хвалявала, не давала нікому спакою, мучыла днём і ўначы, выклікала светлую радасць і чорны гнеў, служыла асноўнай прычынай крывавых спрэчак паміж людзьмі.

Спрадвечныя беднякі Свірыд Мірашнічанка, Васіль Підапрыгара, Сцяпан Кушнір, Цімафій Гарыцвет, Іван Бондар з радасцю і нецярплівасцю чакалі ўрачыстага моманту, калі сход прыме пастанову аб надзяленні іх зямлёй. Усе шматлікія крыўды, нястачы, несправджаныя надзеі засланіліся радаснай верай, што прыйшоў і іх час, што нарэшце і яны змогуць стаць гаспадарамі.

І калі для беднякоў Навабугаўкі рашэнне павяткома з'явілася самай знамянальнай і ўрачыстай у жыцці падзеяй, дык вясковым багацеям яно нагадвала гукі пахавальнага звону. Варчук, Січкар, Дзянісенка, Сазоненка ўсяляк імкнуліся перашкодзіць выкананню рашэння сялянскага сходу. Каб дасягнуць свайго, яны спрабавалі падкупіць вясковых актывістаў, пагражалі ім расправай, а калі ні подкуп, ні пагрозы не дапамагалі, тады людской крывёю яны хацелі прымусіць беднякоў адмовіцца ад імкнення стаць гаспадарамі жыцця.

За няспыннымі спрэчкамі і крывавай барацьбой паміж беднякамі і кулакамі Навабугаўкі мы бачым украінскае сялянства на пераломным павароце гісторыі, яго трагічны лёс пад уладай усялякіх самазваных гетманаў, атаманаў, бацькаў, якія змянялі адзін аднаго з кінематаграфічнай хуткасцю. Мы бачым і вялікае шчасце народа ў змаганні за перамогу рэвалюцыі.

Барацьба за зямлю з'яўляецца асновай супярэчнасці і канфліктаў амаль усіх твораў савецкіх пісьменнікаў аб рэвалюцыі і грамадзянскай вайне на вёсцы. Гэта ж мы бачым і ў рамане «Кроў людская — не вадзіца». Паэтызацыя зямлі тут выступае з асаблівай пераканальнасцю. Героі Стэльмаха бачаць зямлю наяве і ў сне, даражаць ёю, як сваім жыццём, для іх і неба — тая ж самая зямля, якую можна заараць і засеяць, і нават засадзіць райскімі садамі.

Усе аднолькава моцна трымаюцца за зямлю, але не ва ўсіх аднолькавая мэта ў жыцці.

Для Мірашнічэнкі, Гарыцвета, Бондара валодаць зямлёй азначае стаць чалавекам, паўнаўладным гаспадаром жыцця, мець магчымасць свабодна працаваць, перабудаваць жыццё так, каб ніколі не ведаць беднасці і нястач. Тыя думы і мары, надзеі і імкненні, якімі жылі гэтыя беднякі, былі выражаны Кастрычніцкай рэвалюцыяй, і таму Мірашнічэнка, Гарыцвет, Бондар і іншыя адразу сталі на шлях, вызначаны рэвалюцыяй, пайшлі ўслед за Леніным, бо ў праўдзе Леніна ўбачылі сваю ўласную праўду, пачалі горача падтрымліваць сваю народную Савецкую ўладу.

Для Варчука, Січкара, Дзенісенкі, Сазоненкі зямля азначае багацце. Валодаць ёю—значыць мець уладу над іншымі людзьмі, займаць пануючае месца ў грамадстве, з ганарлівасцю і пыхай пазіраць на іншых і дбаць увесь час аб павелічэнні сваіх прыбыткаў.

За зямлю настойліва і ўпарта змагаюцца адны і другія. Не было такой сілы, перад якой бы яны спыніліся. Кожны хацеў мець зямлю, толькі адных гэта жаданне ўзвышала, рабіла больш чалавечнымі, а другіх знявечвала і апустошвала. Заўсёды маўклівы і пануры Гарыцвет нібы перамяніўся, калі яго абралі старшынёй земкамісіі, зрабіўся вясёлым і, едучы першы раз араць сваё, толькі што атрыманае поле, нават апрануў чыстую святочную кашулю. Малюючы суровыя будні вясковай беднаты часоў грамадзянскай вайны, Міхайла Стэльмах паказвае, як пад уплывам рэвалюцыі ўзнімаецца на ўвесь чалавечы рост вечна забіты, прыніжаны і заняволены працаўнік.

Варчука багацце рабіла ўсё больш і больш нелюдзем, злачынцам не толькі на сяле, але і ў сваім уласным доме. З-за зямлі ён стаў забойцам, згубіў усялякае сумленне і нават родную маці выкінуў з дому.

Два варожыя станы сяла Навабугаўкі ўвасабляюць дзве сілы, дзве гістарычныя тэндэнцыі ў развіцці ўкраінскага (і не толькі ўкраінскага) сялянства.

Вясковая беднята, згуртаваная былым матросам, камуністам Мірашнічэнкам, змагаецца за знішчэнне адвечнай сацыяльнай несправядлівасці, за карэнную перабудову самога ладу жыцця.

Гэтая барацьба, натхняемая велічнымі і высакароднымі ідэямі, нараджала такіх самааддадных і нязломных змагароў, як Нячуйвітэр, Антанас Данялайціс, Мірашнічэнка. Такімі ж змагарамі становяцца радавыя працаўнікі сяла—Гарыцвет, Бондар. Служэнне народу складае сэнс іх асабістых імкненняў і мэт. Непрымірымыя да ворагаў, яны гатовы дапамагчы працаўніку, калі працаўнік прыходзіць да іх з павіннай. Так, Мірашнічэнка і Нячуйвітэр дапамаглі вызваліцца з-пад арышту Данілу Підапрыгару, які зрабіўся ахвярай паклёпу ранейшых сваіх аднадумцаў.

Шлях Нячуйвітра, Данялайціса, Мірашнічэнкі — гэта шлях у рэвалюцыю ўсяго працоўнага народа, шлях цяжкі і суровы, але прасторны і светлы, і вёў ён да шчасця не адзінкі, а ўвесь народ.

Імкненне навабугаўскіх беднякоў стаць на ногі, зрабіцца гаспадарамі жыцця сустракае праціўдзеянне з боку заможных сялян. Кулак Сафрон Варчук і яго спадручныя моцна трымаюцца за сваю зямлю, бязлітасна помсцяць усім, хто асмельваецца ўзняць руку на іх уласнасць. Спачатку, праўда, яны спрабуюць подкупам перацягнуць найбольш актыўных беднякоў на свой бок, а калі гэта не ўдаецца, забіваюць, каб тым самым запалохаць іншых. Забілі яны старшыню земкамісіі Васіля Підапрыгару, а затым такім жа чынам разлічыліся з сумленным і ўпартым Цімафіем Гарыцветам.

Раскрываючы супярэчнасці ў асяроддзі сялянства ў эпоху грамадзянскай вайны, аўтар рамана «Кроў людская — не вадзіца» паказвае сапраўдны твар украінскіх нацыяналістаў. Выступаючы ў якасці абаронцаў інтарэсаў кулацтва і буржуазіі, усялякія атаманы ператварыліся ў звычайных грабежнікаў, а іх галоўныя кіраўнікі, атэстуючы сябе абаронцамі Украіны і ўкраінскага народа, на самай справе — гандляры дзяржаўнымі і нацыянальнымі інтарэсамі свайго народа, паслухмяныя прыслужнікі імперыялістычных захопнікаў.

М. Стэльмах паказвае распад і канец пятлюраўшчыны. Найбольш сумленныя ўдзельнікі гэтага бясслаўнага руху парываюць з крывавым мінулым. Прыходзіць з павіннай сотнік Даніла Підапрыгара, былы настаўнік, якога пагнала ў армію нацыянальная рамантыка, прага барацьбы за незалежную Украіну. Ён наіўна лічыў, што змагаецца за незалежнасць краіны, але ўбачыў, што дапамагае ворагам радзімы ўздзець на яе новыя кайданы.

Раман «Кроў людская — не вадзіца» прасякнуты пачуццём глыбокага гуманізму. Паказваючы суровасць і жорсткасць перажытага часу, складаны пераплёт падзей, аўтар выступае палымяным абаронцам жыцця чалавека як самага дарагога і каштоўнага дару прыроды. Лейтматывам да ўсіх замалёвак бязлітаснай барацьбы гучыць песня сляпога Андрэйкі:

Кроў людская — не вадзіца...
Не давай крыві праліцца.

Сляпы Андрэйка маліў відушчых быць людзьмі, не праліваць людскую кроў, бо яна не бязродная вадзіца, што трымаецца на хмарцы і на травіцы, у возеры і ў крыніцы, — кроў трымаецца толькі зямлі, яна — жыццё бацькоў і дзяцей, пяшчотны дзявочы румянец і смелы бляск юначых вачэй, яна — подзвіг воіна і чароўная ўсмешка дзіцяці...

Шырокі эпічны паказ жыцця, багацце аўтарскіх назіранняў, майстэрства ў паказе чалавечых характараў, замалёвак прыроды і побыту народа ставіць раман «Кроў людская — не вадзіца» ў шэраг выдатных з'яў літаратурнага жыцця нашай сучаснасці, у шэраг найлепшых дасягненняў шматнацыянальнай савецкай літаратуры.

---

[1] Михайло Стельмах. Кров людська — не водиця. «Жовтень», 1957, №№ 1, 2, 3, 4.
Михайло Стельмах. Кровь людская — не водица. «Роман-газета» № 11 (143). Москва, 1957.

Маладыя парасткі вакальнага мастацтва

(Аб адным канцэрце студэнтаў беларускай кансерваторыі)

Попыт на спевакоў з добрымі моцнымі галасамі нікольні не зменшыўся ў рэспубліцы, а наадварот — значна ўзрос. Па-ранейшаму некаторыя кіраўнікі прафесіянальных харавых калектываў, у прыватнасці, Маладзечанскага ансамбля, хору радыё, заяўляюць: «У нас няма каму спяваць». А ўся бяда ў тым, што Беларуская кансерваторыя і музычныя вучылішчы яшчэ мала рыхтуюць новых вакалістаў, неабходных для папаўнення творчых калектываў.

Адсюль тая зацікаўленасць і ўвага, з якімі многія аматары музыкі аднесліся да адкрытага канцэрта кафедры сольнага спявання Белдзяржкансерваторыі. Паказ маладых парасткаў вакальнага мастацтва адбыўся напярэдадні новага года. Таму натуральна кожны чакаў пачуць перш за ўсё студэнтаў-выпускнікоў, для якіх новы год будзе пачаткам іх самастойнай творчай працы.

І, вядома, наша жаданне збылося: у канцэрце выступалі чатыры вакалісты пятых курсаў—Зіна Станкевіч і Эдуард Сяргееў—вучні А. Карынскага; Ірма Ляўкевіч і Яўгенія Цвятаева з класа О. Несцярэнкі. Аб вучнях А. Карынскага трэба адразу заўважыць, што яны трапілі да яго ў клас ужо ў апошнія гады вучобы ў кансерваторыі. Што-ж, такія выпадкі нярэдкія ў кансерваторскай практыцы. Аднак можна сабе ўявіць, колькі клопатаў даставілі новаму педагогу студэнты Станкевіч і Сяргееў, якія валодаюць даволі сярэднімі вакальнымі дадзенымі, з масай дэфектаў у галасавым апараце.

Лірыка-каларатурнае сапрана ў Станкевіч гучыць некалькі цяжка, у ім мала паветранай лёгкасці, рухавасці і сапраўднага бляску, што асабліва патрабуецца ад такога роду галасоў. Слухаючы арыю Марфачкі з оперы Я. Цікоцкага «Дзяўчына з Палесся» і «Чорную галку» А. Багатырова ў выкананні выпускніцы, заўважаеш, як яна ўвесь час імкнецца спяваць музычна, жыць вобразамі кожнага твора і як усё гэта ёй з цяжкасцю даецца. Напрыклад, у самым фінале арыі, дарэчы праспяванай Станкевіч пранікнёна, голас яе раптам падвёў, і ўжо тонкай філіроўкі гуку не атрымалася. Хацелася б, каб і каларатурныя пасажы ў песні «Чорная галка» былі апрацаваны з большым тэхнічным майстэрствам і спяваліся значна вастрэй і больш дакладна.

Э. Сяргееў робіць спробы спяваць некалькі асэнсавана, але гэта неяк не кранае слухачоў, таму што сам яго голас па свайму тэмбру не вызначаецца прыгажосцю і высакароднасцю і па дыяпазону недастаткова роўны. Таму выкананыя Сяргеевым вядомая арыя Кузьміча з оперы «У пушчах Палесся» А. Багатырова, раманс Семянякі «Лес» і песня «Не бушуйце, ветры буйныя» Матвеева не пакінулі глыбокага ўражання.

Прыемна слухаць сапраўднае ўдумлівае спяванне, калі яно нешта выказвае, калі за кожнай праспяванай вакальнай фразай устаюць, як жывыя, музычныя вобразы і абуджаюць наша ўяўленне. Іменна такім майстэрствам спявання валодаюць выпускніцы кансерваторыі Ірма Ляўкевіч і Яўгенія Цвятаева. У іх добра пастаўленыя прыгожыя галасы, якія гучаць ва ўсіх рэгістрах свабодна і лёгка. Яны не проста прыгожа спяваюць, а перш за ўсё пры выкананні кожнай рэчы дабіваюцца ў іх мастацкай завершанасці, імкнучыся тонка раскрыць задуму кампазітара. Ірма Ляўкевіч таксама пачала сваё выступленне з арыі Марфачкі, але ў яе выкананні гэты вобраз партызанскай дзяўчыны, засмучанай тым, што доўга не вяртаюцца блізкія таварышы з баявога задання, атрымаўся больш выразным, чым у папярэдняй спявачкі. Уменне хутка пераўвасабляцца дазволіла Ляўкевіч пасля ўсхваляванай лірычнай арыі выканаць з вялікім уздымам і тэмпераментам гліэраўскі раманс «Жыць — будзем жыць» і эстонскую народную песню «Прасніца адпачынку не ведае» вясёлага танцавальнага характару.

Яўгенія Цвятаева са сваім грудным драматычным сапрана, нам здаецца, можа стаць сапраўднай знаходкай для нашага опернага тэатра. Тым больш, апрача бліскучых вакальных дадзеных студэнтка-выпускніца валодае здольнасцю з пачуццём і перажываннем раскрываць складаныя оперныя арыі. У гэтым слухачы дастаткова пераканаліся пры выкананні Цвятаевай драматычна насычанай, пабудаванай на музычных кантрастах арыі Галькі з аднайменнай оперы Манюшкі. З вялікім задавальненнем былі праслуханы і іншыя нумары з рэпертуару спявачкі — раманс «Вясна» Д. Лукаса і песня С. Тулікава аб Радзіме.

Апрача выпускнікоў у канцэрце выступалі тры студэнты-вакалісты старшых курсаў. Ёсць прэтэнзіі да студэнта III курса Ігара Пятровіча з класа А. Карынскага. У юнага спевака мяккага тэмбру барытон, ён вабіць слых сваёй сакавітасцю гучання. Але ні адзін з музычных твораў у выкананні Пятровіча не прагучаў музычна, з душой. Ці спяваў ён «Нёман» Н. Сакалоўскага, ці багаты пачуццямі раманс Ю. Семянякі «Успаміны», або арыю Мізгіра з «Снягурачкі» Рымскага-Корсакава—усюды адны і тыя ж фарбы, адно і тое ж гучанне. І таму ўсё гэта не хвалявала слухачоў.

Праўда, два іншыя выхаванцы таго ж педагога — Міхаіл Пушкароў і Віктар Гур'еў — паказалі сябе з лепшага боку: яны і на сцэне трымаюцца больш вольна, і спяваюць больш выразна і эмацыянальна. Асабліва запомніўся звонкі тэнар В. Гур'ева з добрымі верхнімі нотамі. Толькі нам здаецца, што песня Баяна з оперы «Руслан і Людміла» Глінкі не зусім падыходзіць маладому спеваку. Для яго голасу з драматычным ухілам, у якім часам чуваць нават барытанальныя ноты, павінен быць і рэпертуар адпаведным, хаця, вядома, плаўныя лірычныя рэчы вельмі развіваюць галасы. Але ў песні Баяна, напрыклад, не было дастатковай кантылены гуку, а на нізкіх нотах спявак, відаць, знімаў гук з дыхання, і голас яго нібы правальваўся. Што ж датычыцца «Песні аб Заслонаве» Ул. Алоўнікава і «Шумныя бярозы» Р. Пукста — то абедзве яны былі выкананы з вялікай шчырасцю і задушэўнасцю.

Гаворачы ў цэлым аб гэтым канцэрце, трэба сказаць, што ён многім спадабаўся. І спадабаўся перш за ўсё тым, што па ім можна атрымаць уяўленне аб тых будучых вакальных артыстах, якіх рыхтуе наша кансерваторыя. І многія з іх, нягледзячы на нявопытнасць і адсутнасць адпаведнай культуры спявання (што з часам абавязкова павінна прыйсці), як нам здаецца, зоймуць дастойнае месца і ў оперным тэатры, і ў іншых музычных калектывах рэспублікі. Радасны таксама і той факт, што педагогі кансерваторыі з самага пачатку прышчапляюць сваім выхаванцам любоў да нацыянальнага рэпертуару (у канцэрце было выканана каля пятнаццаці твораў беларускіх аўтараў) і такім чынам рыхтуюць будучых артыстаў да высакароднай творчай дзейнасці.

Г. ЗАГАРОДНІ.

Вечар паэзіі

Нядаўна ў Пінскім гарадскім Доме культуры быў арганізаваны вечар паэзіі. У ім прынялі ўдзел члены літаратурнага аб'яднання пры гарадской газеце «Пінская праўда». Аб рабоце аб'яднання расказаў З. Вагер. Потым пачынаючыя паэты В. Малашкевіч, Ф. Туманаў і В. Каратышэўскі прачыталі свае вершы.

У бібліятэцы Мінскага трактарнага завода заўсёды людна. Праглядзець свежыя газеты, памяняць кнігу прыходзяць токары, фрэзероўшчыкі, зборшчыкі. Актыўным чытачом з'яўляецца і матарыст К. Майсееў. Ён асабліва любіць творы беларускіх пісьменнікаў. На гэты раз яго зацікавіў раман «Калі ўзыходзіла сонца» С. Баранавых.

На здымку: К. Майсееў праглядае кніжныя навінкі. Злева — бібліятэкарка Л. Петухова.

Фота А. Сабадаш.

Хроніка культурнага жыцця

На сёмай гарадской і раённай выстаўцы выяўленчага і прыкладнога мастацтва г. Ліды дэманстравалася каля 120 работ народных умельцаў.

Асаблівую ўвагу прыцягнулі работы тав. Мохава «Сорак год Кастрычніка», «Чарнільны прыбор» і «Гадзіннік». Хатняй гаспадыняй тав. Мароз добра зроблена вышыўка крыжам «Ленін у Разліве». Цікавае палотнішча тав. Бруквы «Абаронім нашых дзяцей». Прастатой і прыгажосцю вылучаўся настольны прыбор слесара тав. Яцыны. Крэмлёўскія вежы і сцяна, тры ўмела размешчаныя самалёты, гадзіннік, зроблены з авіяшкла.

◆

Працоўныя Ельскага раёна ведаюць старшыню раённага камітэта ДТСААФ Г. Плаксіна як добрага лектара і дакладчыка. Ён часты госць на прадпрыемствах і ў калгасах. Свае лекцыі, даклады і гутаркі тав. Плаксін часта суправаджае дэманстрацыяй дыяфільмаў.

У бягучым годзе тав. Плаксін выступіў перад слухачамі сорак разоў.

◆

Нядаўна калгас «Новае жыццё» Нясвіжскага раёна набыў для клуба тэлевізар.

Цяпер у раёне ўжо больш 20 тэлевізараў. Рэгулярна праглядаюць тэлевізійныя перадачы у калгасах «Ленінскі шлях», імя Льва Талстога, імя Някрасава, «Радзіма», у Нясвіжскай МТС, рэмбудканторы, арцелі «Промкааператар».

Тэлевізары ўстаноўлены ў кватэрах пенсіянера тав. Рудакова, муляра тав. Гукайлы, тэхнарука райпрамкамбіната тав. Аленіча і іншых.

◆

Асіповіцкі раённы аддзел культуры арганізаваў шасцімесячныя курсы калгасных баяністаў. Нядаўна адбыўся выпуск курсантаў. 18 баяністаў выехалі ў калгасы раёна для арганізацыі гурткоў мастацкай самадзейнасці.

◆

У вёсцы Гнесічы Навагрудскага раёна адкрыты новы клуб. Першы вечар у ім быў прысвечаны саракагоддзю Вялікага Кастрычніка.

У Гнесіцкім клубе працуюць харавы, драматычны і танцавальны гурткі. У іх актыўна ўдзельнічаюць маладыя калгасніцы Марыя Мяснікевіч, Раіса Шакуля і інш.

Цяпер у Лаўрушаўскім сельсавеце Навагрудскага раёна пяць культурна-асветных устаноў — два клубы, сельскі Дом культуры, калгасны клуб і бібліятэка.

КІНО

„Нашы суседзі“

Жыццярадаснае, вясёлае і дасціпнае мастацтва кінокамедыі заўсёды карысталася папулярнасцю ў нашых гледачоў. Аднак за апошнія некалькі год яны так і не ўбачылі (за выключэннем, бадай, «Верных сяброў» і «Карнавальнай ночы») ніводнай па-сапраўднаму ўдалай камедыі. На шчасце, цяпер у галіне камедыйнага жанра намецілася некаторае ажыўленне. Сведчаннем таму можа служыць фільм «Нашы суседзі», які выйшаў на экраны рэспублікі. Ён створаны калектывам студыі «Беларусьфільм» (аўтары сцэнарыя М. Антоненкаў і В. Севела, рэжысёр-пастаноўшчык Сплашноў).

«Нашы суседзі» — лірычная камедыя. У ёй многа цікавых эпізодаў, удалых рэплік, жартаў, смешных палажэнняў і сюжэтных паваротаў. Стваральнікі фільма імкнуліся з'яднаць у адно забаўнае з павучальным, каб глядач не толькі смяяўся, але і раздумваў.

Дзеянне камедыі адбываецца ў нашы дні, у камунальнай кватэры вялікага жылога дома. Герой фільма—Сяргей Цярэхін атрымаў тут пакой. Суседзі з цікаўнасцю разглядаюць новага жыхара. Сярод іх маляр Мурашка—бацька вялікай сям'і, бабка Сушкова з унукам Віцькам, малады настаўнік Размысловіч, загадчык ашчаднай касы Шпакоўскі са сваёй жонкай Людмілай Паўлаўнай.

Сяргей Цярэхін хутка выклікаў прыхільнасць да сябе ўсіх жыхароў. А сам... закахаўся ў дачку Шпакоўскіх—Святлану, якая працуе ў даведачным бюро. Яе маці, па недарэчнасці, прыняўшы Сяргея за буйнага навуковага работніка, лічыць, што ён —добрая партыя для дачкі і ўсяляк імкнецца уладкаваць яе шчасце. Гэтымі кадрамі пачынаецца кінакамедыя, якая адразу ж прыцягвае да сябе ўвагу гледача.

Нажаль, многія па-сапраўднаму камедыйныя эпізоды існуюць у фільме самі па сабе. І гэта атрымалася не выпадкова. Развіццё камедыйнай інтрыгі павінна вызначацца ўчынкамі і характарамі галоўных дзеючых асоб, яны павінны быць удзельнікамі камедыйных сітуацый.

Слабасць сцэнарыя ў значнай меры абмежавала магчымасць акцёраў Л. Фрычынскага і Н. Карнеевай—выканаўцаў ролей Сяргея і Святланы. У іх адносінах няма вострых жыццёвых сутыкненняў, якія склалі б змест камедыйнага канфлікту. Таму асноўнай «спружынай» сюжэта з'яўляюцца нязначныя і непраўдападобныя непаразуменні, якія ўзнікаюць паміж героямі. А гэта адразу падрывае веру ў праўдзівасць і жыццёвасць характараў герояў. Не маглі ж, на самай справе, жывыя, рэальныя маладыя людзі разысціся толькі з-за таго, што ў час вечарынкі Віцька, які сядзіць паміж Сяргеем і Святланай, у момант, калі ўсе жыхары ўзнялі бакалы, крыкнуў: «Горка!», чым і збянтэжыў дзяўчыну. Таму, нягледзячы на намаганні рэжысёра і артыстаў зрабіць маладыя персанажы «Нашых суседзяў» цікавымі і запамінальнымі, яны гэтага не дасягнулі.

Найбольшая ўдача выпала на долю вопытных майстроў камедыйнага жанра Г. Глебава і О. Вікланд. Створаныя імі вобразы мужа і жонкі—у карціне найбольш яркія і смешныя. Так атрымалася не толькі таму, што прафесіянальнае майстэрства гэтых акцёраў больш адточанае і багатае, чым майстэрства маладых выканаўцаў, а ў першую чаргу таму, што ў іх распараджэнні быў больш востры і насычаны драматургічны матэрыял.

Лепш пашанцавала ў фільме другарадным персанажам, якія ў большасці сваёй даволі выразна індывідуалізаваны. Сярод іх, у першую чаргу, трэба адзначыць артыста А. Адоскіна, які выконвае ролю дзівакаватага настаўніка Размысловіча, артыста К. Сарокіна, які ў вобразе ніколі не сумуючага маляра Мурашкі злалеў добра спалучыць смешнае і лірычнае, а таксама артыстаў В. Краўчанку (жонка Мурашкі), Л. Ржэцкую (бабка Сушкова), М. Пятрова (яе ўнук Віцька).

Трэба аднак сказаць, што нягледзячы на добрую ігру большасці акцёраў, нягледзячы на часты смех у зале, гледачы выходзяць пасля прагляду карціны ўсё ж незадаволенымі... І думаецца, што справа тут, перш за ўсё, у некаторых праліках пастаноўшчыкаў.

Карціне «Нашы суседзі» не хапае лёгкасці і натуральнасці, якія з'яўляюцца абавязковымі элементамі кожнага твора камедыйнага жанра. Аўтары не заўсёды ўмеюць камедыйна вырашаць тую ці іншую сцэну і тады паяўляюцца слязліва-меладраматычныя сцэны накшталт размовы Людмілы Паўлаўны са Святланай, калі яна даведалася, што Сяргей Цярэхін—просты слесар і вырашыла выдаць дачку за Размысловіча, або такія малавыразныя, некамедыйныя сцэны, як вечарынка з прычыны наваселля Цярэхіна.

Ёсць у фільме сцэны, якія ідуць ад непатрабавальнасці, дрэннага густу аўтараў і якія не маюць ніякіх адносін да развіцця асноўнай сюжэтнай лініі, як сцэна «запасу вады» ва ўвесь посуд, які ёсць у доме.

Аўтары «Нашых суседзяў» рабілі камедыю аб такіх жыццёвых з'явах, якія іншы раз заканчваюцца не заўсёды весела. Таму адна няправільная дэталь, лішняя камічная фарба, і замест камедыі можа атрымацца пародыя, замест гумару—пустое «камікаванне». І трэба сказаць, што стваральнікі фільма не заўсёды пазбягаюць такой небяспекі, не заўсёды знаходзяць адзінства «праўды» і «камедыйнасці». Камунальная кватэра, паказаная ў фільме, у нейкай меры тыповая для многіх дамоў даўняй пабудовы. Але аўтары спрабуюць пераканаць, што такія кватэры ёсць у новых дамах. У нас цяпер будуюцца не толькі многа новых дамоў, але і робіцца ўсё магчымае, каб у гэтых дамах кожная сям'я мела як магла больш бытавых выгад.

Ясная, дакладная фатаграфія карціны (аператар А. Булінскі) у цэлым адпавядае агульнаму жыццярадаснаму, прыўзнятаму тону. Добра зняты партрэты герояў. Аднак у карціне мала цікавых здымачных пунктаў, не заўсёды дастаткова камедыйна зняты паасобныя сцэны. Усе натурныя сцэны «Нашых суседзяў» здымаліся ў Мінску. Аднак гарадскія пейзажы ў карціне зняты невыразна. Цяжка па некалькіх мільгаючых планах вуліц і дамоў скласці якое-небудзь уяўленне аб новым, прыгожым горадзе, якім з'яўляецца Мінск.

Да ўдачы фільма трэба аднесці музыку кампазітара Б. Макраусава. Мелодычныя, лёгка запамінальныя песні, без сумнення, хутка заваююць папулярнасць сярод гледачоў, з поспехам будуць выконвацца эстраднымі калектывамі. У новай кінокамедыі «Нашы суседзі» ёсць некаторыя мастацкія пралікі, слабыя месцы. Аднак агульнае ўражанне ад фільма прыемнае, радаснае. Беларускія кінематаграфісты робяць добрую справу: шукаюць новыя шляхі для кінокамедыі, прысвечанай нашай сучаснасці, жыццю нашых простых савецкіх людзей.

С. ІВАНОЎ.

На здымку: кадр з кінафільма.

На экранах у студзені

На экранах рэспублікі днямі пачала дэманстравацца кінокамедыя «Нашы суседзі». Хутка будуць паказаны наступныя фільмы. Кінаапавесць «Дом, у якім я жыву» (вытворчасць кінастудыі імя М. Горкага)—яркае і хвалюючае апавяданне пра лёс людзей аднаго дома. Кінаапавесць «Барэц і клоун» — вытворчасць кінастудыі «Масфільм»—апавядае пра лёс таленавітых людзей—клоуна і дрэсіроўшчыка Анатоля Дурава і барца Івана Паддубнага.

Кінафільм «Авіцэна» Ташкенцкай кінастудыі, прысвечаны памяці Ібн Сіны — вялікага таджыкскага філосафа, матэматыка, прыродазнаўца і паэта X—XI стагоддзяў.

Будуць дэманстравацца таксама замежныя кінафільмы: «Прыгоды ў залатой бухце» вытворчасці Пражскай студыі дзіцячага фільма, кітайская карціна «Сям'я», румынская—«Трывога ў гарах», японская—«Калі любіш» і інш.

Для студэнтаў тэхнікума

Цесная дружба ўстанавілася паміж артыстамі Бабруйскага драматычнага тэатра і студэнтамі Жыліцкага сельскагаспадарчага тэхнікума. Яна нарадзілася яшчэ ў мінулым годзе, калі артысты ставілі на сцэне тэхнікума спектакль «Персанальная справа».

Нядаўна артысты паказалі ў тэхнікуме два спектаклі: «Сям'я злачынца» і «Паўторны візіт».

А. СІДАРЭНКА.

На кніжнай паліцы

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі мастацкай, дзіцячай і музычнай літаратуры:

Якуб Колас. «На ростанях». Трылогія. На рускай мове. Пераклад з беларускай мовы Яўг. Мазалькова. Тыраж 50 тыс. экз., стар. 592. Цана 10 руб. 65 кап.

Іван Грамовіч. «У лесе на палянцы». Апавяданні. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 56. Цана 60 кап.

Алесь Шашкоў. «Ранняй вясною». Апавяданні. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 36. Цана 40 кап.

А. Платнер. «Соль жыцця». Вершы. Пераклад з яўрэйскай мовы. Тыраж 4 тыс. экз., стар. 88. Цана 2 руб. 15 кап.

Мікола Хведаровіч. «Залаты лістапад». Вершы. Прадмова Д. Палітыкі. Тыраж 4 тыс. экз., стар. 228. Цана 4 руб. 75 кап.

«Пад сцягам Кастрычніка». Зборнік твораў беларускіх пісьменнікаў для мастацкага чытання. Склаў Р. Шкраба. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 312. Цана 4 руб. 80 кап.

Роберт Бёрнс. «Шатландская слава». Выбранае. Пераклады з англійскай мовы Я. Семяжонава. Тыраж 3. тыс. экз., стар. 124. Цана 2 руб. 15 кап.

Андрэй Упіт. «Апавяданні». Пераклад з латышскай мовы Ул. Пігулеўскага. Прадмова Ігната Муйжнека. Тыраж 4 тыс. экз., стар. 320. Цана 6 руб. 55 кап.

Леў Мірачыцкі. «Сцежкамі вялікага паэта». Фатаздымкі А. Дзітлава. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 52. Цана 60 кап.

Б. Смольскі. «Беларуская музыка за 40 год». Тыраж 3 тыс. экз., стар. 44. Цана 1 руб. 10 кап.

Крышан Чандр. «Выбранае». Прадмова А. Кукаркіна. Пераклады А. Паўловіча і Я. Скрыгана. Тыраж 4 тыс. экз., стар. 284. Цана 5 руб. 40 кап.

А. Якімовіч. «Казка пра смелага вожыка». Малюнкі В. Ціхановіча. Тыраж 50 тыс. экз., стар. 20. Цана 90 кап.

Янка Купала. «Паэмы». Малюнкі М. Бельскага. Тыраж 8 тыс. экз., стар. 92. Цана 5 руб. 60 кап.

«Рускія народныя казкі». На рускай мове. Зборнік склалі А. Нячаеў і К. Рыбакова. Вокладка і форзац Г. Клікушына. Тыраж 100 тыс. экз., стар. 352. Цана 5 руб. 65 кап.

«Над краем спяваюць гудкі». Нарысы пра буйнейшыя заводы і фабрыкі Беларусі. Склаў П. Рунец. Афармленне А. Лісічнікава. Тыраж 8 тыс. экз., стар. 168. Цана 4 руб. 80 кап.

І. Вольпер. «Скарб пад зямлёй». Пераклад Ф. Зарубанавай. Малюнкі Я. Таубвурцэля. Вокладка П. Калініна. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 112. Цана 2 руб. 80 кап.

Г. Шыловіч. «Твая дарога». Нарысы. Малюнкі Ю. Пучынскага. Тыраж 7 тыс. экз., стар. 120. Цана 2 руб. 30 кап.

Уладзімір Корбан. «Янка і санкі». Байкі і вершы. Малюнкі М. Гурла. Тыраж 8 тыс. экз., стар. 48. Цана 70 кап.

М. Шумілін. «Песня аб партыі». Для хору з фартэпіяна. Словы А. Дзеружынскага. Тыраж 1 тыс. экз., стар. 8. Цана 75 кап.

Ю. Семяняка. «Зося». Словы А. Міцкевіча. Пераклад А. Бачылы. Тыраж 1 тыс. экз., стар. 4. Цана 50 кап.

Яўгені Глебаў. «Фантазія для баяна». Тыраж 2 тыс. экз., стар. 16. Цана 2 руб. 50 кап.

«Янка». Беларуская полька. Для змешанага хору з фартэпіяна. Апрацоўка А. Туранкова. Тыраж 1 тыс. экз., стар. 4. Цана 65 кап.

Г. Анчыкаў. «Любімай» Раманс для голасу з фартэпіяна. На рускай мове. Словы І. Іўніка. Пераклад з чувашскай мовы В. Папова. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 8. Цана 1 руб.

«Зборнік п'ес для фартэпіяна». Тыраж 2 тыс. экз., стар. 92. Цана 16 руб. 50 кап.

З замежнай пошты

Абаронца Галівуда

У апошні час Галівуд траціць свае пазіцыі ў Еўропе. Раней на экранах Францыі, Англіі, Італіі і іншых еўрапейскіх краін больш палавіны карцін былі заакіянскага паходжання. Гэта было абумоўлена спецыяльнымі дагаворамі. Цяпер ужо не тое. Расце нацыянальная кінематаграфія краін Еўропы, і на еўрапейскія экраны ўсё менш трапляе амерыканскіх карцін.

Аднак ёсць у Еўропе адна краіна, якая з'яўляецца, так сказаць, «бастыёнам» Галівуда,—гэта Федэратыўная Рэспубліка Германіі. Па дагавору звыш 60 працэнтаў карцін, якія дэманструюцца на экранах Заходняй Германіі, павінна быць амерыканскага паходжання. Між тым, заходнегерманская кінематаграфія таксама расце і развіваецца і неабходнасць выканання гэтага дагавору шкодна адбіваецца на яе развіцці. І недарма прадстаўнік нямецкіх кінафірм Ганс Геблін звярнуўся ў міністэрства прамысловасці са скаргай на такое становішча (у Заходняй Германіі кінематаграфія падпарадкавана гэтаму міністэрству). Але адтуль быў атрыманы адказ: дагавор заключаны—яго трэба выконваць. Затое германскіх кінопрадпрыймальнікаў суцешылі. Аказваецца, на экраны Федэратыўнай Рэспублікі сурова забаронены доступ фільмам з Савецкай краіны, з краін народнай дэмакратыі і з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Хіба гэта не заахвочванне нацыянальнй кінематаграфіі!

Як відаць гэта было дрэнным суцяшэннем для нямецкіх кінопрадпрыймальнікаў. Прынамсі, яны пачалі дамагацца прыёму ў самога канцлера Адэнаўэра і ўрэшце дамагліся гэтага.

Што-ж паведаміў германскім кінопрамыслоўцам яго правасхадзіцельства? Ён спакойна выслухаў іх скаргі, а затым паспяшаўся іх парадаваць, сказаўшы: «У Федэратыўнай Рэспубліцы створаны найлепшыя з усіх еўрапейскіх краін умовы для амерыканскай кінематаграфіі». Наўрад ці гэтае паведамленне прывяло ў захапленне германскіх кінопрамыслоўцаў. Недарма некаторыя газеты з дакорам называлі адказ Адэнаўэра «непатрыятычным».

Адэнаўэр цвёрда стаіць на сваіх пазіцыях, ён дзейнічае на славу Галівуда, на шкоду нацыянальнай кінопрамысловасці.

Гісторыя аднаго тунеля

«Ажыццяўляецца мара кожнага еўрапейца!».

«Найвялікшае дасягненне сусветнай тэхнікі напярэдадні рэалізацыі!».

Так крычалі загалоўкі буржуазнай прэсы Англіі і Францыі пра тунель пад Ламаншам. Газеты падрабязна расказвалі пра праекты стварэння тунеля.

Гэтая ідэя ўзнікла ў XVII стагоддзі. У пачатку XVIII стагоддзя распрацоўваліся першыя тэхнічныя варыянты тунеля. Але ўзаемаадносіны Англіі і Францыі, частыя войны прымусілі адкласці праекты. Іншая карціна стварылася ў больш мірную эпоху, у сярэдзіне XIX стагоддзя. Дарэчы сказаць, мала хто ведае, што славутая кампанія Суэцкага канала марыла пракласці тунель і пад Ламаншам. Праекты былі блізкімі да ажыццяўлення.

Нарэшце, у канцы XIX стагоддзя была дасягнута дамоўленасць аб стварэнні тунеля. Больш таго, у 1898 г. нават пачаліся работы і быў пракладзены адзін кіламетр з боку французскага берага і каля чвэрткі кіламетра ад англійскага. Праўда, і тады паявіліся хмары на палітычным гарызонце —работы давялося спыніць.

Аднак, навошта ўспамінаць далёкае мінулае, калі пры цяперашнім стане тэхнікі задача стварэння тунеля не асабліва цяжкая з тэхнічнага боку. Праўда, у эпоху гігантскага развіцця авіяцыі Ламанш не перашкода для зносін паміж краінамі. Але ўсё-ж тунель можа быць і цяпер эканамічна выгадным, асабліва пры перадачы грузаў, калі не заўсёды выкарыстоўваецца паветраны транспарт.

«Мара чалавецтва блізкая да ажыццяўлення!», — пісала французская газета «Монд». А газета «Нувель літэрэр» падлічыла нават, колькі раманаў напісана аб будучым тунелі. Іх аказалася больш за пяцьдзесят. Але фантазія раманістаў — не рэчаіснасць. Групы інжынераў накіроўваліся па старой трасе, быў правераны першы кіламетр шляху, пракапаны яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя. Ён аказаўся, праўда, засыпаным, але яго, відаць, лёгка было адновіць. Газеты радаваліся. І вось, нібы па ўзмаху чарадзейнага жазла, усе яны замоўклі. Тунель пад Ламаншам быў раптам забыты.

Што-ж здарылася?

Сакрэт гэтай гісторыі раскрыла газета «Монд» пасля чатырохмесячнага маўчання. Як высветлілася ў арганізацыі тунеля павінны былі прыняць удзел восем таварыстваў: міжнароднае таварыства па стварэнню тунеля пад Ламаншам, англійскія — акцыянерная фірма «Вялікая будоўля», кампанія па падземных тунелях, кампанія міжнародных зносін, французскія — аб'яднанне чыгунак, таварыства падземных тунеляў і інш. І вось, аказваецца, гэтыя шматлікія таварыствы яшчэ да таго, як пачаць будаваць тунель, пачалі старанна дзяліць шкуру незабітага мядзведзя. Пачалі загадзя падлічваць магчымыя прыбыткі і горача спрачацца паміж сабой. Вядома, французская газета абвінавачвае ва ўсім прагнасць англійскіх таварыстваў. Але высвятляецца, што некаторыя англійскія органы друку ў сваю чаргу абвінавачваюць французаў. Адным словам, капіталістычныя аб'яднанні пасварыліся з-за будучых прыбыткаў яшчэ да пачатку будаўніцтва.

Усё гэта — яркая ілюстрацыя ўжывання новых дасягненняў тэхнікі ва ўмовах буржуазнага грамадства.

„Голас Малайі“

У цяперашняй незалежнай Малайі будуць нарэшце выдадзены ўсе 12 тамоў легенд, паданняў і песень малайскіх народаў, сабраныя выдатным малайскім фальклarystam Сугубра Кансе, які нядаўна памёр у англійскай турме.

Сугубра Кансе ўсё сваё доўгае жыццё прысвяціў збіранню роднага фальклору. Ён пачаў запісваць песні яшчэ дзесяцігадовым хлопчыкам, а памёр ва ўзросце 79 год.

Дзейнасць гэтага выдатнага фальклырыста прыцягнула асаблівую ўвагу англійскіх каланізацыйных улад. Сабраныя ім паданні і песні ярка выражалі імкненне народаў Малайі да свабоды. Песні гэтыя здаліся небяспечнымі. Яшчэ 40 год назад, калі Сугубра Кансе выдаў першы зборнік малайскіх песень, гэтая кніга тут жа была канфіскавана англійскімі ўладамі. Тады ж быў імі арыштаваны і сам Сугубра Кансе, які з'яўляўся не толькі фальклырыстам, але і выдатным выканаўцам малайскіх народных песень (ён часта спяваў іх пад акампанемент нацыянальных інструментаў на вуліцах гарадоў). Збіральнік і выканаўца песень Малайі здаваўся небяспечным для англійскіх каланізатараў.

Індыйскія газеты паведамляюць, што песні і легенды народаў Малайі, сабраныя Сугубра Кансе, толькі аднойчы былі выдадзены ў Індыі, яшчэ ў пачатку гэтага стагоддзя. Калі ж крыху пазней, ужо ў 20-х гадах адзін з выдаўцоў у Бамбеі спрабаваў зноў надрукаваць яго песні, на друкарню быў накладзены арышт і набор рассыпалі англійскія паліцэйскія. З паведамлення тых-жа індускіх газет відаць, што адным з першых культурных мерапрыемстваў новага незалежнага ўрада Малайі будзе поўнае дванаццацітомнае выданне песень, паданняў і легенд, сабраных Сугубра Кансе. Яны выдаюцца вялікім тыражом і будуць называцца «Голас Малайі».

Е. САЛАЎЕЎ.

Галоўны рэдактар Мікола ТКАЧОЎ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у сераду і суботу.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-21-53.

АТ 00607

Друкарня імя Сталіна